№ 40 (350) 31 кастрычніка 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Дзяды 1988**
Як гэта пачыналася 15 гадоў таму.
старонка 13

**Аляксандар Макін**
Ганкураўскі ляўрэат хоча жыць у Беларусі.
старонка 7

**Курт Вонэгут**
Гемарой з узьдзьнаньнямі.
старонка 15

**Анатоль Лябедзька**
пойдзе на пэнсію.
старонка 3



# Дзяды



КАВАЛЬ ЮРАСЬ МАЦКО. З ТРЫПЦІХУ «ДЗЯДЫ»

Старонка 11.

## Помнік Станюце

**3 лістапада а 14.30 на Ўсходніх могілках адкрыюць помнік легендарнай Стэфаніі Станюце.** Акторка пачала свой сцэнічны шлях у Першым беларускім таварыстве драмы і камэдыі пад кіраўніцтвам Фларыяна Ждановіча, а потым усё жыцьцё працавала ў Купалаўскім, стаўшы сымбалем беларускага тэатру.

## Урачыстасьці

**У Менску традыцыйнае шэсьце на Дзяды пачнецца 2 лістапада а 11.30 ад мэтро «Парк Чалюскінцаў».** Мітынг у Курапатах — з 15.00 да 17.00.

У Горадні 1 лістапада пройдзе ўскладаньне кветак на магілы слаўных землякоў (пісьменьнікаў Карпюка і Васілька, акадэміка Астроўскага, палітвязьня Кісяля), у другой палове дня — Ланцуг памяці на вуліцы Савецкай.

## Магутная магнітная бура

**У 13 гадзінаў 28 кастрычніка на Сонцы адбылася ўспышка: у космас пайшло велізарнае, у 13 разоў большае за Зямлю воблака зараджаных часьціцаў зоркавага рэчыва.** Ягонай энэргіі хапіла б, каб згатаваць ваду ўва ўсіх зямных акіянах. Большая частка выбуху дасягнула Зямлі на наступны дзень. Над Японіяй, Каліфорніяй, Тэхасам зьявілася палярнае зьзяньне. Нямеччына скараціла колькасьць палётаў пасажырскіх самалётаў дзеля пагрозы збояў апаратуры. Радары працавалі зь перашкодамі, згубленая сувязь зь японскім касьмічным спадарожнікам «Кадама». Зафіксаваныя шматлікія збоі ў працы спадарожнікавых тэлефонаў. Наступствы буры для здароўя адчуваюцца яшчэ некалькі дзён.

## Кіраўнікі «Вэлкаму» на волі

**29 кастрычніка КДБ выпусьціў затрыманых больш за тыдзень таму кіраўнікоў апарату мабільнай сувязі «Вэлкам» на волю.** Іх адно што абавязалі своечасова зьяўляцца па выкліку ў адпаведныя органы. Па-ранейшаму невядомыя колькасьць затрыманых і іхныя імёны. 31 кастрычніка падазраваным у злачынстве маюць вылучыць абвінавачаньне паводле арт.210 часткі 4 Крымінальнага кодэксу — за раскраданьне ў асабліва буйных памерах.

## Шніпа глушаць

**Паводле зьвестак з розных крыніцаў, паэта Віктара Шніпа на пасадзе галоўнага рэдактара «ЛіМу»** мае замяніць былы намесьнік старшыні Дзяржкамдруку Ўладзімер Глушакоў, які праславіўся выкананьнем функцый цэнзара ў прыватнай друкарні «Мэджык» перад выбарамі 2001 г.

АШ

## Рух у бок кабарэ

**Рэпартаж Міхала Анемпадыстава** з фэстывалю «Бардаўская восень» на старонцы 14.

## Падпіска

**Нагадваем, што падпісацца на газэту** можна на любы куточак Беларусі. Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі. На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку». Дык падпісвайся!

# У розных камэрах з Хадаркоўскім

**З кожным новым урыўкам сэрыялу пра Хадаркоўскага мацнее адчуваньне інакшасьці.**



REUTERS

Першаю адзнакаю неразуменьня (і вінаватая тут хутчэй дамба ў Керчанскай затоцы, а ня сумныя прыгоды алігарха) была спроба згадаць, да якіх жа выбараў робіцца гэткія прыўкрасныя шоў. Пэўна што будуць нейкія выбары, але якія? Няма, як той Гогаль пісаў, адказу. Ня нашы, дальбог, ня нашы.

Далей увогуле пачалося нешта дзіўноснае. Выступаюць нейкія адвакаты, у панядзелак падаюць нейкія акцыі, суд бярэ бок алігархавага адваката. (Калі ёсьць у сьвеце нешта больш сумнеўнае ў пляне маральнае чысціні, чым мільярдэры ў першым пакаленьні, то гэта іхнія адвакаты.)

Хіба толькі голас Пуціна гучаў зразумела: торгу ня будзе, урад ня ўцягвайце, закон ёсьць закон. Але зноў жа, адкуль гэтыя запэўніваньні, што ніякіх абагульненьняў (разумеем: перагляду вынікаў прыватызацыі) ня будзе? Не панашаму гэта.

Хутчэй па-амэрыканску. Канфлікт вакол «Юкасу» разьвіваецца, быццам у кніжцы Хайнлайна: мільярдэр змагаецца з урадам, выкарыстоўваючы Закон, які праўна працуе, калі грамадзянін можа сабе дазволіць не лічыць грошы. У Хайнлайна мільярдэр заўсёды перамагае. Але гэта не фантастыка, гэта — Расея.

Выпрабоўваецца ня ўся дэмакратыя, як спрабуюць павярнуць справу шмат якія палітыкі і журналісты. Выпрабоўваецца магчымасьць абароны правоў на буйную ўласнасьць, набытую сумнеўным шляхам, але легітымізаваную сродкамі закону. Для дэмакратыі ўвогуле гэты фрагмэнт грамадзкіх адносінаў значыць вельмі шмат. Да таго ж, багаты чалавек мае больш сродкаў абароны, і калі ён пацерпіць паразу ў змаганьні з уладаю, што казаць пра іншых.

Факт, што ў Беларусі сытуацыя іншая. І з адвакатамі, і з мільярдэрамі. І з прыватызацыяй, і з акцыямі. Наўрад ці наш «зайчык» спужаецца арышту хоць якога прамыслоўца. Ён у нас сьмелы, ня тое што рубель расейскі. І Беларусь — не Расея.

**Аляксандар Карольчык**

# Трэці тэрмін Пуціна

Зьняважлівая пасадка Хадаркоўскага не пакідае сумневаў: Пуцін хоча такую Думу, якая б магла зьмяніць расейскую канстытуцыю. Ня факт, што ён яе атрымае. Ні рэгіянальныя лідэры, ні гіганцкія карпарацыі ад такога праекту ня будуць у захапленьні. Але само жаданьне паказальнае. Расейская інтэлігенцыя і лібэральны бамонд у шоку, ды што яны могуць зрабіць. Аргумэнты пра бясправе слаба ўзьдзейнічаюць на публіку, якая ня верыць, што можна было праўна ператварыцца з камсамольца ў мільярдэра за пяць гадоў. Народ цешыцца, Зюганаў з Глазьевым маўчаць. Махнула рукой нават інтэлігенцыя: лепш Хадаркоўскі на пяці квадратных мэтрах, чым Чачэнія і гексаген, як перад мінулай пуцініядай.

Лукашэнка таксама разьлічвае, што «Пуцін выйдзе з выбараў кратна ўзмоцненым».

А што ж вы, дэмакраты-русафілы? І дапамог вам ваш Пуцін?

**Барыс Тумар**

# Арыфмэтыка міністра Мількоты

**Газавая тэма гэткая ж невычэрпная, як расейскія радовішчы. У тым сэнсе, што яны таксама толькі на першы погляд невычэрпныя.**

Позьнекастрычніцкая гарачыня ў Горадні ператварыла перадапошнюю нядзелю месяца ў сьвята: на вуліцах поўна гаманкога люду, у паветры лунае пах гарэлага лісьця, а сьцены дамоў зьзяюць залацістым сьвятлом невысока ўзьнятага сонца. За горадам позьняя восень: рэдкая зеляніна азімых, сьвежаўзараныя палеткі, халоднае рудое лісьце паміж дрэвамі ды вільготны яскравазялёны мох — а ў Горадні раскашуюць хрызантэмы й позьнія астры, і нават вяргіні захоўваюць імпазантны выгляд.

Наступныя выходныя Горадня сустрэла пад сьнегам, які зьявіўся сёлета як ніколі рана. Белае рэчыва на зялёных газонах і галінах дрэў, зь якіх не пасьпела апасьці лісьце, вяртае думкам сур'ёзны лад: месца цяпла-адпачынка-ўраджаю заступае трыяда холад-паліва-кошты. Вось жа, чытаю ў «Звяздзе» 22 кастрычніка: «Для насельніцтва ў нас газ дацiруецца дзяржавай. І таму яго падаражаньня яно не адчуе». Словы гэтыя гучаць з вуснаў міністра жыльлёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандра Мількоты.



PHOTO.BYMEDIA.NET

«Для насельніцтва ў нас газ дацiруецца дзяржавай. І таму яго падаражаньня яно не адчуе».

Тое, што дзяржава пра нас клапоціцца, мы ведаем з маленства. Тое, што клапоціцца яна нашымі ж грашыма і не заўсёды старанна, ад нас імкнуцца схаваць усё жыцьцё. У агромністай колькасьці выпадкаў — пасьпяхова.

Колькі ж каштуе газ? Простая даведка па тэлефоне пацьвердзіць: за кубамэтар чалавек плаціць 143,7 руб., то бок прыблізна 65 даляраў за тысячу куб.м. Шчасьлівыя ўладальнікі лічыльнікаў на газ (гэтаксама як на ваду, дарэчы) аднадушна сьведчаць, што ніколі не выбіраюць закладзеных у норму 8 кубоў на чалавека, якія нешчасьлівыя неўладальнікі спраўна аплачваюць. А гэта значыць, што ў цану варта дадаць удакладняльны каэфіцыэнт. Надбаўка, паводле павярхоўнай ацэнкі, складзе ня менш за траціну, і цана сапраўды выкарыстанага кватэрным спажыўцом газу сягае за 85 даляраў (1000 кубоў), а ў найбольш ашчадных напэўна пераходзіць за 100 даляраў.

Між тым расейскія кошты газу для Беларусі складаюць крыху больш за 37 даляраў, як паведаміла на інтэрнэт-канфэрэнцыі сама аўтарытэтная ў краіне крыніца. Ці ня ў гэтым крыніца аптымізму сп.Мількоты?

**Аляксандар Карольчык, Горадня**

## Касьмічныя амбіцыі

**Беларускія навукоўцы маюць намер у лістападзе трапіць у сусьветны топ-500 вытворцаў супэркамputараў.** У Аб'яднаным інстытуце праблемаў інфарматыкі скончаюць выпрабаваньні супэркампутарнай канфігурацыі кластэрнага ўзроўню «СКІФ» К-500 з хуткасьцю 716,8 млрд апэрацый у сэкунду. «Валоданьне супэркампутарам тэхнічна сувымернае з валоданьнем ядравымі тэхналёгіямі», — мяркуе Мікалай Парамонаў, выканаўчы дырэктар праграмы.

Толькі 12 краінаў у сьвеце распрацоўваюць і вырабляюць супэркампутары: ЗША, Нямеччына, Японія, Вялікая Брытанія, Паўднёвая Карэя, Канада, Кітай, Ганконг, Швэцыя, Расея ды Індыя.

Беларуская кампутарная праграма разьвіваецца паралельна з нацыянальным касьмічным праектам.

**МБ; БелаПАН**

ЧУТКА ТЫДНЯ

## Скобелева на пэнсію?

**Паводле інфармацыі «НН», на пэнсію мае быць адпраўлены лідэр славянафілаў у лукашэнкаўскім атачэньні Эдуард Скобелеў.** Скобелеў працаваў галоўным рэдактарам «Информационного бюллетеня Администрации президента». У сярэдзіну ўранку Э.Скобелеў яшчэ знаходзіўся на сваім працоўным месцы. На пытаньне, наколькі праўдзівая інфармацыя пра яго адстаўку, спачатку сказаў, што «гэта нязначны факт», а пасьля направіўся: «Ніякіх праблемаў такіх не ўзьнікала, ёсьць другія праблемы».

**Павал Сумарока**

# Адзінота беларускага караля

Чым даўжэйшы стаж лукашэнкаўскага прэзыдэнцтва, тым больш шматслоўнымі і мутнымі робіцца прэзыдэнцкія прэс-канфэрэнцыі. Хутка ён, як Фідэль, будзе гаварыць да ўпаду. За гэтым — страшэнная адзінота беларускага караля. Вакол яго няма адпаведнага ўзроўню памочнікаў, здольных дзейнічаць публічна. Даводзіцца быць самому сабе іміджмэйкерам і палітэхнолягам ды растрачваць дзяржаўны час на слоўную эквілібрыстыку. Лёгка рэзацца з Чубайсам, калі над тым варожыцца лёс Хадаркоўскага.

Улазячы ў кожную дзірку пэрсанальна, асабіста камэнтуючы якасьць газэты «Белорусский рынок» і дапамагаючы цяплічнаму камбінату прадаваць у Башкартастан іх бледныя таматы, Лукашэнка адводзіць увагу выбарцаў ад сваёй нядольнасьці зрабіць тое, што пасьпяхова ажыцьцявілі Гавал і Квасьнеўскі, якіх ён так грэбліва мянуе «праваабаронцамі»: мадэрнізаваць краіну, як таго вымагаюць нацыянальныя інтарэсы, і разьвярнуць яе на Захад, забясьпечыўшы пры гэтым тылы.

**Мікола Бугай**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Ёсьць такая функцыя



Чаму сябры АГП трымаюць Лукашэнку за ідыёта?

Нават калі заўтра высьветліцца, што пурытанін Севярынец піша сваю калёнку пад траўкай, а Шушкевіч — сталы падпісчык сайту www.porno.ru, беларускі нацыяналізм усё адно захавае шанец перамагчы. Як палітычны рух ён будзе прыпрачаны, калі згубіць сацыяльны падтэкст і ператворыцца ў гербарый культуралягічных экспанатаў. Гісторыя ня ведае аніводнай мадэлі масавага нацыянал-вызвольнага руху, які б ня меў сацыяльных лёзунгаў. Нават правая «Салідарнасьць» забаязана сваім нараджэньнем росту цэнаў на кракаўскую кілбасу.

У гэтым пляне беларускі нацыяналізм стаіць адной нагой у магіле. Першая заканадаўчая ініцыятыва апазыцыі ў палацы прадстаўнікоў, распрацаваная АГП і фракцыяй «Рэспубліка», — праект бюджэту на 2004 г. — адна з самых рэакцыйных фіскальных ініцыятываў, якія ведаў сьвет. Яго differencia specifica — татальнае скарачэньне дапамогі нерэнтабэльным прадпрыемствам, сельскай гаспадарцы і рэгрэсіўная шкала падаткаў.

Чаму сябры АГП трымаюць Лукашэнку за ідыёта? Відавочна, што дзяржаўныя мэдыі данясуць да кожнага працоўнага МАЗу, што апазыцыянэры мараць пакінуць буйныя прадпрыемствы без дапамогі. Няўжо рабацяга, пачуўшы пра тое, што ў яго з заробку вылічаць у адсотках болей, чым у дырэктара, выйдзе на акцыю «Так жыць нельга!»?

А хто ўвогуле пасьля гэтага будзе хадзіць на апазыцыйныя маніфэстацыі? Магчыма, self-made-мэны і вумэны — клеркі, банкіры, дырэктарат, каб нагнаць апэтыт перад візытам у рэстаран сушы, будуць мачыцца з АМОНам і ствараць ланцуг нераўнадушных аўтааматараў апошняй мадэлі «фальксвагену»?..

Добра, скажа чытач. А ў чым альтэрнатыва рынкавым фантасмагорыям АГП? Людзям падавай матэматычна-эканамічную функцыю спажывецкага попыту. Функцыя, якая прайшла іспыт часам, — дыяграма Венечкі Ерафеева. Калі памятаеце, герой раману «Масква—Петушкі» фіксаваў спажывецкі попыт сяброў сваей брыгады, адкладваючы на X дні месяца, а на Y — колькасьць выпітага алькаголю ў грамах:




Вось яна, графічная квінтэсэнцыя welfare state. Чалавек, не ператвараючыся ў Габсэка або Шэйлака, застаецца самім сабой. Без напругаў можа дазволіць сабе поўбатла на працы, і вечарам пасядзець, і раз на тыдзень, набыўшы дзьве кубанскай, дзьве чацьвяртушкі «Расейскай», па пузыры чырвонага і ружовага ды два бутэрброды, паехаць да каханкі за горад.

**Лёлік Ушкін,**
левы тусоўшчык

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Выспа Ўкраіна



Найвялікшай памылкай Эўропы, паводле Юшчанкі, было б сказаць: «Беларусь не адбылася».

У самы разгар жарсьцяў вакол выспы Тузла мне давялося пабываць ва Ўкраіне на сустрэчы правай моладзі, прысьвечанай пашырэньню Эўразьвязу.

Украіна сёньня нагадвае аграмадную дзіўную выспу. Плывучы субкантынэнт плошчай 600 тыс. кв.км ды з насельніцтвам 48 млн чалавек ужо адышоў ад берагоў Расеі й яшчэ не прыстаў да Эўропы. Выспа Ўкраіна ўсё аддаляецца і ад Беларусі: скрозь украінская мова, жоўта-блакітная рэкляма й сваё, асобнае жыцьцё ў зачараваным плаваньні.

Дамба ад Кубані да Тузлы — апошняя расейская спроба зачапіцца за вялікую ўкраінскую выспу — атрымалася па-мядзьвежаму няўклюднай. Уся Ўкраіна ўжо каторы тыдзень бурліць: надта ўжо відавочнай выглядае агрэсія. І ўлада, і апазыцыя патрыятычна ўзбуджаныя; народ сур'ёзна баіцца вайны. Аддай расейцам Тузлу — адкусяць Крым. Украінскія памежнікі выстаўляюць кардон з пантонаў ды раскопваюць землярадамі пратоку: мы — выспа!

Ёсьць у гэтым нешта брытанскае. Або нават ірляндзкае.

Што цікава, і сама Беларусь увесь апошні год *украінізуецца* — ператвараецца ў геапалітычную выспу постсавецкага архіпэлягу. Вымушаная дзяржаўніцтва ўлады адасабляе нас ад Расеі, і вось ужо гаснуць маскоўскія каналы, і ўсходні бераг ахінае газавая смуга, і адзін толькі Аляксандар Рыгоравіч, як той Леанід Данілавіч, ведае, у які бок мы цяпер дрэйфуем.

Маладыя эўрапейцы, што сабраліся на Кіеўскі форум, былі, відаць, крыху зьбянтэжаныя. Аграмада Ўкраіны, Беларусь ды Малдова іх палохалі й фігуравалі ў размовах як смутны далягляд Айкумены. Украіну асьцярожна хвалілі, Беларусь уголас шкадавалі, Малдове прыгадвалі камуністаў.

Украінцы насядалі на Эўропу, патрабуючы прынцыповага рашэньня аб тэрміне чарговага пашырэньня.

Найлепшыя ўражаньні пакінуў Юшчанка — на прэзыдэнцкіх выбарах, што пройдуць ва Ўкраіне праз год, ён яўны фаварыт (рэйтынг — 24%, у прэм'ера Януковіча — 14%). Гэткі здаровы інтэлігентны мужык зь ціхай харызмай. На сустрэчы з эўрапейцамі я запытаўся ў яго пра Беларусь. Перакладчыкі нечакана замоўклі — пытаньне было па-беларуску, — і замежнікі пачалі махаць рукамі: «In English!», «In Russian». А Юшчанка з трыбуны: «Кажыце па-беларуску, я перакладу!» Найвялікшай памылкай Эўропы, паводле Юшчанкі, было б сказаць: «Беларусь не адбылася». І ўжо да нас: «Змагайцеся за Беларусь, мы з вамі!»

Эўрапейцы згодна ківалі галовамі. Юшчанку праводзілі авацыямі стоячы.

**Павал Севярынец,**
лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту»

# Лябедзька пойдзе на пэнсію

## Калі народная кааліцыя вырашыць пастаўленыя задачы

У дэпутатаў Вярхоўнага Савету XIII скліканьня з пэўнага часу праз пэўныя ўмовы выпрацавалася традыцыя зьбірацца ў кавярнях. У мінулую суботу такая сустрэча адбылася ў кавярні «Бярозка». Дэпутаты сьвядома выбралі гэтага монстра савецкае рэстараннае справы: «Бярозка» месьціцца на плошчы Перамогі, якой так зачакалася апазыцыя. На гэты раз з дэпутатамі Вярхоўнага Савету XIII скліканьня сабраліся таксама «рэспубліканцы» і прадстаўнікі Асамблеі дэпутатаў мясцовых саветаў. На сустрэчы панаваў добры настрой. Пра мінулае гаварылі мала, што апошнімі гадамі бывала рэдка. «Першы раз у такой сытуацыі, што ня ўсіх ведаю», — прызнаўся **Станіслаў Шушкевіч**.

«Круглы стол» пад мудрай назвай «Кансалідацыя як галоўная ўмова перамогі» распачаў лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль Лябедзька**. Ён цалкам лягічна адзначыў, што мэта сустрэчы — аб’яднаньне і кансалідацыя. На яго погляд, вельмі важна «далучыць да палітычных працэсаў» людзей, дагэтуль ня зьвязаных з партыямі. «Сёньня створаны падмурак народнай кааліцыі», — сказаў Анатоль Лябедзька. Аднак, па інфармацыі «НН», працоўная назва пакуль іншая: «Пяцёрка-плюс» альбо «Пяць з плюсам». Менавіта гэты варыянт прыйшоўся найбольш даспадобы апазыцыйным лідэрам.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**«Індзейцаў» малавата», — наракаў Анатоль Лябедзька ў панядзелак.**

Новыя людзі, паводле меркаваньня лідэра ПКБ **Сяргея Калякіна,** дапамогуць «нарасьціць мускулы», каб зьмяніць уладу. Калякін таксама гаварыў, зь якой павагай ставіцца да сяброў групы «Рэспубліка» і іх дзейнасьці ў цяжкіх умовах палаткі. «Падзяку трэба выказаць прэзыдэнту, які давёў сытуацыю да такой стадыі, што нашы палітычныя рознагалосьсі адышлі на другі плян», — сказаў ён.

Кіраўніка БСДГ С.Шушкевіча яднаньне апазыцыянэраў ня дзівіць: падчас другой сусьветнай такія розныя краіны, як Англія, Францыя і Савецкі Саюз, разам душылі нацызм. «У нас адна мэта — усталяваць дэмакратыю, — гаварыў Шушкевіч. — Далей мы можам спрачацца, а па гэтых пытаньнях спрэчак няма».

### Прадстаўніца гарвыканкаму была зьдзіўленая

Дыскусія ішла актыўна. **Людміла Гразнова**, якая ня так даўно выйшла з «Хартыі-97», зрабіла камплімэнт камуністам з ПКБ ды заявіла, што «мы — эліта, ад нас залежыць сытуацыя ў краіне». **Аляксандар Бухвостаў**, кіраўнік БПП, лічыць, што кансалідацыйная праца патрэбная ня толькі сярод эліты, але і сярод працоўных. **Уладзімер Нісьцюк** з БСДП (НГ) у сваім выступе зазначыў, што ягоная партыя яшчэ не далучылася да «пяцёркі», але за аб’яднаньне выступае шмат партыйцаў. Афіцыйная ж пазыцыя партыі стане вядомая пасьля сьнежаньскага плenуму ЦК.

Генэрал **Валеры Фралоў** распавёў пра тое, чым займаецца «Рэспубліка» па-за сьценамі палаты прадстаўнікоў. Нядаўна ў Магілёве была наладжаная сустрэча былых і сёньняшніх дэпутатаў розных узроўняў. Прадстаўніца гарвыканкаму была зьдзіўленая, калі пабачыла, што менскія госьці заклікаюць «не да барацьбы з кімсьці, а да барацьбы за выбарцаў». Натхнёныя ўдачай, рэспубліканцы хочуць працягваць такія сустрэчы ў іншых рэгіёнах краіны. Генэрал-дэпутат перакананы, што кааліцыя прынясе «сур’ёзны плён», калі засяродзіцца на «сацыяльных пытаньнях з палітычным падтэкстам».

### Міжнародная супольнасьць як панацэя

Ахвотных выказацца было шмат. Беларускамоўны камуніст з ПКБ, сябра прэзыдыюму Асамблеі дэпутатаў мясцовых саветаў **Васіль Бычок** наракаў, што апазыцыянэры ня маюць доступу да СМІ. Вырашэньне праблемы ён бачыў у звароце да міжнароднай супольнасьці, каб дапамагла «прабіць заслону». Яшчэ адзін сябар прэзыдыюму дэпутацкай Асамблеі **Леанід Гаравы** падкрэсьліў, што на выбарах, відавочна, «гульня будзе ісьці не па правілах, але да гэтага мы гатовыя». **Павал Знавец** неаднаразова падкрэсьліваў, што трэба зрабіць усё магчымае, каб «перадача ўлады адбылася канстытуцыйным шляхам». Менавіта Знавец прапанаваў згадаць усіх дэпутатаў ВС XIII скліканьня, якія памерлі, загінулі альбо зьніклі бязь вестак. Называліся прозьвішчы ня толькі апазыцыянэраў Ганчара і Карпенкі, але й прэзыдэнцкага кантралёра Мікалуцкага.

На нарадзе прысутнічаў і **Генадзь Грушавы**, які ў 1996 г. быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савету на давыбарах, але праз фактычны роспуск парлямэнту так і ня змог выканаць свой дэпутацкі абавязак. Грушавы выказаў жаданьне ўвайсьці ў адзіны сьпіс дэмакратычных кандыдатаў. У сваім выступе ён быў катэгарычны: «Ня выйграем выбараў — гаварыць пра нейкую пэрспэктыву не давядзецца». Яднацца ж, паводле словаў Грушавога, трэба не між сабой, а з выбарцамі.

Дэпутат ВС’XIII з Бабруйску, камуніст **Ігар Аннушкін** дыягнаставаў: «Большасьць людзей сёньня супраць рэжыму, але ня з намі, не з палітычнымі партыямі». Аннушкін прапанаваў вызначыцца з адзінай ідэяй, брэндам, пад якімі кааліцыі можна было б ісьці на выбары. Але пра брэнд нават гаворкі пакуль не было. Нарада абмежавалася мроямі пра будучую кааліцыю ды стварэньне грамадзкае ініцыятывы «Народны дэпутат», мэта якой — «аднаўленьне ў Беларусі парлямэнтарызму і мясцовага самакіраваньня». Дэпутаты прынялі зварот да міжнароднай супольнасьці, заклікаўшы яе будаваць адносіны з афіцыйным Менскам на аснове пакрокавай стратэгіі, якая прадугледжвае і саступкі беларускіх уладаў.

А скончылася сустрэча дубальтовай кніжнай прэзэнтацыяй. На першым пляне быў Андрэй Клімаў з сваёй «Антыўтопіяй 2016», на другім — Анатоль Лябедзька, які «з-пад крыса» прадэманстраваў прысутным адзіны асобнік дакумэнтальнай хронікі «Хочам ведаць праўду». Наклад яе зьявіцца ў сьнежні.

### Хадыка бароніць камуністаў

У апошні тыдзень «пяцёрка» працавала дынамічна. У панядзелак 27 кастрычніка яе лідэры «пайшлі ў народ», г.зн. у Міжнародны адукацыйны цэнтар на вуліцы газэты «Праўда». Народам аказаліся партыйныя актывісты і прадстаўнікі розных дэмакратычных няўрадавых арганізацый. Сустрэча пачалася Лябедзькавым экскурсам у гісторыю «пяцёркі». Лідэр АГП нагадаў, што напачатку было шэсьць партыяў, і выказаў шкадаваньне, што не ўдалося знайсьці паразуменьня з кіраўніцтвам БСДП (НГ). Пазьней Сяргей Калякін дадасьць, што галоўная праблема — у асобе Міколы Статкевіча, «які вырашыў, што будзе наступным прэзыдэнтам Беларусі».

Лідэры «пяцёркі» высока ацэньвалі вынікі папярэдняй дзейнасьці. **Вінцук Вячорка** запісаў ёй у заслугі тое, што рэфэрэндум, які рыхтаваўся ўладамі, быў адкладзены. (Лябедзька ж казаў, што і на выпадак рэфэрэндуму ў «пяцёркі» ёсьць «чарнавы варыянт пляну дзеяньняў».) «Партыйнае аб’яднаньне — гэта заўсёды лепш, чым аб’яднаньне асобаў, якімі б добрымі яны ні былі», — зрабіў выпад Вячорка, фактычна, у бок блёку «Свабодная Беларусь».

Калякін працягнуў гістарычную аналёгію: у Нямеччыне пачатку 1930-х партыйцы не дамовіліся пра супольную барацьбу з дыктатурай нацыстаў і пасьля сустрэліся ў канцлягеры... А **Юры Хадыка** прапанаваў працягнуць руку камуністам і ўстрымацца ад нападак на іх, нагадаўшы 1941 год, калі заходнія дэмакратыі паразумеліся з таталітарным Савецкім Саюзам, каб зьнішчыць супольнага ворага...

Партыйных актывістаў, якія задавалі пытаньні, найбольш цікавіла, наколькі трывалае сёньняшняе партыйнае аб’яднаньне, ці захаваецца яно і надалей — пасьля выбараў. Лябедзька пажартаваў: калі на выбарах будуць вырашаныя пастаўленыя задачы, «мы можам ісьці на пэнсію». Ягоны жарт выклікаў ажыўленьне сярод партыйных кіраўнікоў. Многія казалі пра дасягнуты ўзаемны давер і яднаньне, якія яны спадзяюцца захаваць і надалей.

У суботу лідэры «пяцёркі» будуць сустракацца з партыйнымі актывістамі ў Гомелі, а ў нядзелю наведаюць Магілёў. Лябедзька кажа, што было вырашана «да пачатку выбарчай кампаніі праехаць праз усю Беларусь». Паралельна йдзе праца над адзіным выбарчым сьпісам. «Пяцёрка» пакуль не сьпяшаецца вызначацца ні з назвай кааліцыі, ні з брэндам, але ўжо цяпер думае над праблемай «раскруткі» апошняга. На расейскія тэлеканалы ў яе практычна няма надзеі. Як і на беларускія. Таму на парадку дня — кампанія «ад дзьвярэй да дзьвярэй». І ўвесь цяжар яе, вядома, ляжа на плечы шараговых сяброў апазыцыйных партый — «індзейцаў», паводле прафслэнгу. «Індзейцаў» малавата», — наракаў Анатоль Лябедзька ў панядзелак.

**Сяргей Ёрш**

# «Вясну» судзілі двойчы

**За апошнія два месяцы ліквідаваныя восем арганізацыяў, пад пагрозай закрыцьця адзінаццаць. У адказ на ліквідацыю «Праваабарончага цэнтру «Вясна» праваабаронцы зладзілі ў судзе страйк.**

Працэс над «Вясной», што скончыўся 28 кастрычніка, быў цалкам беларускамоўным. Унікальнай была і пазыцыя судзьдзі. Спн. Валянціна Кулік палічыла недаказанымі амаль усе абвінавачаньні Міністу, апроч аднаго. (Зазвычай на гэткіх працэсах усе патрабаваньні Міністу суд падтрымлівае.) Зрэшты, і таго «аднаго» — «грубага парушэньня заканадаўства» падчас выбараў 2001 г. — хапіла, каб «Вясну» ліквідаваць.

Восем «вясноўцаў», пачуўшы пра ліквідацыю арганізацыі, паселі на падлогу і пачалі скандаваць «Ганьба!». Лёзунг хутка перамяніўся ў «Вясна!». Судзьдзя дачытвала прысуд пад няможкнае скандаваньне. Пасьля абвяшчэньня прысуду кіраўнік арганізацыі Алесь Бяляцкі, а таксама Валянцін Стафановіч, Уладзімер Лабковіч, Уладзімер Вялічкін, Зьміцер Салаўёў, Мікола Лемяноўскі, Аляксей Колчын і Алег Жлутка засталіся сядзець у зале суду. А.Бяляцкі назваў вырак «чыста палітычным». «Нас зачынілі таму, што ў хуткім часе будуць выбары», — казаў У.Лабковіч.

Журналістаў і прадстаўнікоў грамадзкасьці паступова выцесьнілі з будынку Вярхоўнага суду, а «вясноўцаў» завезьлі ў Ленінскі РАУС для складаньня пратаколаў.

Судзілі іх назаўтра аб 11-й у тым самым РУУСе. Тры судзьдзі ўправіліся хвілінаў за сорак. Сем вясноўцаў атрымалі па пяць базавых адзінак (мінімальнае пакараньне за «непадпарадкаваньне законным патрабаваньням службовай асобы», згодна з арт. 166 Адміністрацыйнага кодэксу). Уладзімер Лабковіч атрымаў па максымуме — 10 б.а. Адзінае, чым ён вылучыўся, — упарта патрабаваў перакладчыка. Судзьдзя Дзьмітры Жданок адказаў: «Паколькі Вы нарадзіліся ў Менску і раней удзельнічалі ў расейскамоўных судовых працэсах, павінны па-расейску разумець». Цікава, што Бяляцкага судзьдзя Аляксандар Шылько забясьпечыў перакладчыкам па першым патрабаваньні.

**Аркадзь Шанскі**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Гутарка з Алесем Бяляцкім на старонках 13—14.

# Эўрапейцы міжволі

## Кааліцыя Народнай грамады, Партыі жанчынаў і «Хартыі'97» ідзе на выбары пад дэвізам «Беларусь у Эўропу»

У суботу, 1 лістапада, у Менску пройдзе прэзэнтацыя «Эўрапейскай кааліцыі», стварэньне якой ініцыявала Народная грамада. Паводле словаў старшыні БСДП (НГ) Міколы Статкевіча, галоўная і доўгатэрміновая мэта кааліцыі — інтэграцыя Беларусі ў Эўропу: «У нас урад антыэўрапейскі, таму даводзіцца займацца гэтым грамадзянам. Калі на працягу найбліжэйшых 15 гадоў Беларусь ня стане сябрам Эўразьвязу, яна патрапіць у склад Расеі», — лічыць Статкевіч.

На тым тыдні адбылося паседжаньне рабочай групы па стварэньні эўракааліцыі, у якім бралі ўдзел кіраўнікі БСДП (НГ), Партыі жанчынаў В.Матусевіч і дзеячы блёку «Свабодная Беларусь». Старт кааліцыі адкладалі тры месяцы, і Статкевіч шкадуе пра страчаны час. А недалучэньне сацыял-дэмакратаў да «пяцёркі» ён тлумачыць тым, што «тры зь пяці партыяў выступаюць за саюз з Расеяй» і што яны ня хочуць прыняць да сябе Партыю жанчын на чале з былой прэс-сакратаркай Леаніда Козіка Валянцінай Матусевіч.

Налета можа быць створаны «выбарчы блёк эўрапейскай арыентацыі». М.Статкевіч абяцае, што ў новым блёку будзе шмат новых твараў, жанчынаў і моладзі. Тое самае калісьці абяцалі і арганізатары блёку «Свабодная Беларусь». Што да канкурэнцыі зь «пяцёркай» і магчымага выхаду на выбары ў палату прадстаўнікоў двума апазыцыйнымі блёкамі, Статкевіч лічыць: «Калі спрацуе машына фальсыфікацыі, то афіцыйныя вынікі будуць аднолькавыя ў любым выпадку». Але, на яго погляд, менавіта ў эўрапейскай кааліцыі станоўчая плятформа, якую можа падтрымаць большасьць выбаршчыкаў Беларусі. Адна з задачаў блёку — сфармаваць пазытыўную грамадзкую думку ў адносінах да Эўразьвязу. Ужо ў пачатку наступнага году мяркуецца разгарнуць інфармацыйную кампанію. У яе рамках абяцаюць распаўсюдзіць каля мільёна ўлётак, зь якіх беларусы нарэшце даведаюцца, што такое Эўразьвяз. Сымпатыі беларускага грамадзтва цяпер выразна праэўрапейскія, а апазыцыя імкнецца выкарыстаць гэта, пакуль таго самага не зрабілі лукашэнкаўцы.

Сябар «Свабоднай Беларусі» Андрэй Саньнікаў ад камэнтароў устрымаўся. Зазначыў толькі, што «гаворка ідзе не пра далучэньне, а пра стварэньне».

«Я ня бачу сэнсу ў аб'яднаньні людзей, якія не кантралююць рэсурсаў», — скептычна ацэньвае новую ініцыятыву палітоляг Уладзімер Мацкевіч.

Рыторыка лідэраў Народнай грамады ў пытаньнях эканомікі і адносінаў з Расеяй апошнім часам блізкая да лукашэнкаўскай, тады як «Свабодная Беларусь» гуртуе радыкальную апазыцыю. Няясна, што ж тады аб'ядноўвае гэтых палітыкаў, акрамя боязі спазьніцца на выбарчы цягнік і асабістых рахункаў з тымі ці іншымі партыйнымі лідэрамі «пяцёркі». Кааліцыі БСДП (НГ) і «Свабоднай Беларусі» нялёгка будзе разьвітацца з іміджам часовага хаўрусу аўтсайдэраў.

**АТ**

### У школу з капустай

**Кожны супрацоўнік крычаўскай СШ №6 дзеля забесьпячэньня навучальнай установы гароднінай павінен прынесьці па тры галоўкі капусты.** Такія абавязкі на настаўнікаў ускладзеныя ўпершыню. У мінулыя гады караняплоды вырошчвалі на прышкольных сядзібах альбо «зараблялі» ў калгасах вучні.

**Кацярына Яленская, Крычаў**

### Патрэбны сьцяг

**Баранавіцкія ўлады вырашылі стварыць сьцяг гораду.** Абвешчаны конкурс на найлепшы малюнак. Любы ахвотны можа дасылаць свае работы ў неабмежаванай колькасьці на адрас: Баранавічы, вул.Горкага, 20, пак. 207.

Герб у Баранавіч ужо ёсьць — створаны за савецкімі часамі, ён мае за фон чырвона-зялёнае поле. На чырвоным намаляваны цягнік, а на зялёным — палова шасьцярэнькі. Цяпер неяк будуць прыстасоўваць пад той герб яшчэ й сьцяг. Відаць, выйдзе такое самае вычварэньне.

### Мэнінгіт у Баранавічах

**Да Баранавіч таксама дайшоў мэнінгіт. Ужо чатыром пастаўлены дыягназ мэнінгакокавай інфэкцыі.** Захварэлі трое дзетак з аднаго садка, а падчас праверкі дактары выявілі й дарослага, які зьяўляўся носьбітам вірусу, але сам не хварэў і адчуваў сябе добра.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

### Вырасьлі каноплі

**Незвычайны ўраджай вырас сёлета на градах пэнсіянэркі з Астраўца.** Ня морква, ня бульба, а каноплі. Сабраць іх «дапамаглі» бабулі памежнікі з Астравецкай камэндатуры ды супрацоўнікі міліцыі. Каноплі пацягнулі на 14,5 кг. Справа перададзеная ў суд.

**Мар'ян Вянгроўскі, Астравец**

# Ва ўніятаў адбіраюць шапік

**У кастрычніку полацкія грэка-каталікі атрымалі адразу дзьве кепскія весткі, абедзьве з гарвыканкаму.** У першым лісьце, датаваным 8 кастрычніка, уніятаў папярэдзілі, што іх грамада мусіць «прадставіць адпаведныя дакумэнты для перарэгістрацыі ў Полацкі гарвыканкам у тэрмін да 1 сьнежня 2003 г.». Працэс перарэгістрацыі рэлігійных арганізацыяў у Беларусі павінен прайсьці за два гады, а мінуў толькі год. Адкуль узялася гэтая патрэба прысьпешваньня?

А лістом, які датуецца 21 кастрычніка, старшыні Рады грэка-каталіцкай грамады Полацку Міколу Шараху паведамілі аб «спыненьні з 30 студзеня 2004 г. дамовы арэнды ад 21.05.2003 г. № 72а памяшканьня па адрасу вул.Камуністычная, 28 агульнай плошчай 9 кв.м.». У гэтым памяшканьні, якое ўяўляе сабой прахадны пад'езд жылога дому, знаходзіцца шапік рэлігійнай літаратуры. Прычына скасаваньня дамовы ў лісьце тлумачыцца тым, што гарадзкія ўлады вырашылі правесьці адкрыты аўкцыён на права атрыманьня памяшканьня ў арэнду. Сёлета ў траўні, калі ўніяты перазаключалі дамову арэнды на новыя тры гады, ні пра які аўкцыён размова ня йшла. І яшчэ адна істотная акалічнасьць. Мікола Шарах атрымаў памяшканьне ў арэнду толькі дзякуючы таму, што сам жыве ў гэтым пад'езьдзе. Абласная пажарная служба дала дазвол на стварэньне гандлёвай кропкі з улікам таго, што арандатар здольны пры патрэбе хутка забясьпечыць скразны праход праз дом.

Полацкая грэка-каталіцкая грамада — адна з самых аўтарытэтных у Беларусі. Менавіта ў капліцы Сьв.Параскевы Полацкай захоўваецца копія Турынскай плашчаніцы. Усяго ў Беларусі маецца толькі дзьве такія рэліквіі.

**Тамаш Гурба, Полацак**

# Копысь урэшце «здалі»

**У адпаведнасьці з пастановай ураду «Аб добраўпарадкаваньні г.п.Копысі Аршанскага раёну» ўсе работы павінны былі скончыцца да 30 жніўня 2003 г.** Дата зусім невыпадковая. Менавіта тут у гэты дзень 49 гадоў таму нарадзіўся першы прэзыдэнт. Але з розных прычынаў здача аб'екту пад ключ адбылася толькі пры канцы кастрычніка. За паўгоду Копысь была амаль уся перабудаваная. Да ўласных шасьцісот жыхароў далучылася амаль столькі ж будаўнікоў з усяе Беларусі. Працавалі тыя вахтавым мэтадам, таму даўно мясцовыя крамы ня мелі такіх прыбыткаў ад продажу алькаголю ды цыгарэтаў. У мястэчку правялі новы водапровод, пабудавалі АТС, міні-рынак, газіфікавалі прадпрыемствы і ўстановы (месьцічам «блакітнае паліва» давядзецца весьці да хатаў за свой кошт), рэканструявалі больніцу, школу, клюб, іншыя сацыяльна-культурныя аб'екты.

Найстарэйшае з паселішчаў Аршаншчыны, дзякуючы вялікім зямельным работам, было зноў дасьледаванае археолягамі. Пасьля раскопак старажытнае замчышча (т.зв. «Пятроўскі вал») было рэканструявана пад зону адпачынку... Ледзь пасьпявалі археолягі за тэхнікай, якая перакопвала мястэчка ўздоўж і ўпоперак. «Пашчыравалі» тут і невядомыя асобы з мэталашукальнікамі. Кажуць, былі знойдзеныя некалькі манэтных скарбаў, але да навукоўцаў і музэйшчыкаў яны ня трапілі. Навёўшы прыгажосьць, у Копысі ня вырашылі пакуль галоўнай праблемы — працаўладкаваньня. Адзінае прадпрыемства — керамічны цэх ААТ «Воршабудматэрыялы» — дае працу ўсяго дзясятку жанчынаў, якія вырабляюць з прывазной гліны (свая, цудоўнай якасьці, не выкарыстоўваецца, бо няма сродкаў для яе перапрацоўкі), дэкаратыўныя вазы ды гаршкі. Каб адрадзіць славу копыскіх кахляроў мінулых стагодзьдзяў, патрэбныя вялікія інвэстыцыі.

На малую радзіму прэзыдэнта цяпер ня сорамна вазіць турыстаў, але пажадана, каб яны ня бачылі ўбогасьці суседніх вёсак ды ня мелі кантактаў з тубыльцамі.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Шапікі на прыпынках

**Ня ў прыклад менскім уладам, у Воршы камэрцыйныя шапікі з вуліцаў ніхто прыбіраць не зьбіраецца.** Наадварот, гарадзкое ўпраўленьне архітэктуры прапануе прадпрымальнікам месцы пад шапікі на транспартных прыпынках. Праўда, з умовай добраўпарадкаваньня тых прыпынкаў. Гэта абыходзіцца прыватнікам прыкладна ў 1,5 тыс. даляраў. Як пасьля цёплага дажджу грыбы, растуць «Владушки» і «Эриданы»... На жаль, беларускамоўных назваў пакуль няма.

**ЯЖ**

## Першы крыты мост

**У Асіповічах скончылася будаўніцтва новага чыгуначнага мосту.** Будаваўся ён зь сьнежня 2002 г. Памеры мае такія: 11 м вышыні, 150 м даўжыні і 3 м шырыні. Гэта першы крыты мост у краіне. Скончыцца будоўля павінна была ў траўні, але вось нарэшце 27 кастрычніка па мосьце прашпацыравалі першыя мінакі.

Асноўныя канструкцыйныя матэрыялы — празрысты плястык, звыштрывалае шкло, сталь. Прастаіць такая канструкцыя без капітальнага рамонту амаль 50 гадоў. Каштарыс праекту — 2 млрд руб. Суму выдаткавала Беларуская чыгунка. З гэтай справы атрымаў пэўны прыбытак і раён, бо большасьць работ на мосьце выканаў Асіповіцкі завод жалезабэтонных канструкцыяў.

**Рыгор Латышэвіч, Асіповічы**

# Узбуйненьне замест рэформы

Унітарныя прадпрыемствы «Ўправа транспарту і сувязі Менгарвыканкаму», «Менскпасажыраўтатранс», «Менскгарэлектратранс», «Менскі мэтрапалітэн» будуць аб'яднаныя і ўтвораць новае транспартнае камунальнае прадпрыемства «Менсктранс». Абгрунтоўваецца такое рашэньне тым, што на новым прадпрыемстве можна будзе аптымізаваць працэсы кіраваньня і, значыцьць, скараціць адміністрацыйны апарат. У найбліжэйшыя гады будзе звольнена ад 25 да 35% кіраўнікоў сярэдняга зьвяна і спэцыялістаў, што дазволіць дасягнуць значнай эканоміі сродкаў. Цяжка сабе ўявіць, як для абслугоўваньня адной гіганцкай структуры можа патрабавацца менш кіраўнікоў, чым для чатырох меншых. Эфэкт маштабу, які заключаецца ў зьмяншэньні адміністрацыйных выдаткаў з павелічэньнем памеру фірмы, працуе толькі да пэўнай мяжы. Потым гэтыя выдаткі пачынаюць ізноў расьці дзеля складанасьцяў у камунікацыі, што ўзьнікаюць на занадта буйных прадпрыемствах. Ёсьць небясьпека, што менавіта такая сытуацыя ўзьнікне і на новым «Менсктрансе».

Менгарвыканкам сваім рашэньнем пацьвердзіў незацікаўленасьць у рэфармаваньні гарадзкога транспарту. А яно неабходнае: дзяржава моцна субсыдуе транспартныя прадпрыемствы, бо ўсе яны стратныя. Дый узровень сэрвісу застаецца непрымальна нізкім. Тарыфы на праезд растуць хутчэй за інфляцыю — а транспарт так і ходзіць перапоўненым, машынны парк у жахлівым стане, парушаюцца экалягічныя нормы.

Для рэформы ж звычайна патрабуецца адваротнае аб'яднаньню — рэструктурызацыя, падзел на драбнейшыя структуры, перавод на гаспразьлік, частковая прыватызацыя (акцыянаваньне). Цяпер Менгарвыканкам стварае гіганта, рэфармаваць які пасьля будзе амаль немагчыма. А існаваць ён будзе за тыя ж грошы падаткаплатнікаў — і тых, што будуць купляць адзіны праязны, і тых, што ў тралейбусах ня душацца.

**Дамінік Міхайловіч**

## ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### Менскі абутак патаньнее

**Менскі гарсавет адмяніў 5%-ны падатак з продажу абутку, выразбленага ў сталіцы.** Зьніжэньне цаны ў сярэднім складзе 5 тыс. рублёў на пару. А імпартны абутак падаражэе на 15% за кошт павелічэньня падатку на яго рэалізацыю. Апошнім часам на складах вытворчасьцяў, што ўзьніклі на базе былое фабрыкі «Прамень», назапасілася больш за 1,5 млн пар нерэалізаванага абутку.

### Барысаў ліквідуе шапікі

**Барысаўскія ўлады абавязалі прадпрымальнікаў зьнесьці шапікі да 1 лістапада.** Гарвыканкам зьбіраецца, як і ў Менску, замяніць шапікі на павільёны з гандлёвымі залямі. Павільён каштуе 5 тыс. даляраў.

### 1000-ы нумар «Витебского курьера»

**28 кастрычніка ў Віцебску выйшаў тысячны нумар незалежнага «Витебского курьера»,** аднаго з найбуйнейшых рэгіянальных выданьняў.

### «Google» ідзе на біржу

**Адзіны сусьветны інтэрнэт-пошукавік, які мае беларусізаваную вэрсію, «Google»,** зьбіраецца выйсьці на нью-ёрскую біржу ў пачатку наступнага году. Публічны дэбют фірмы можа мець форму інтэрнэт-аўкцыёну. Штогадовы прыбытак фірмы складае 500 млн даляраў (зь іх 150 млн — чыстага). Вартасьць фірмы пасьля ўваходу на біржу складзе 15—25 млрд даляраў. Столькі ж каштуе найбольшы канкурэнт «Google» — пошукавік «Yahoo».

«Google» зарабляе на банэрах зь сеткавымі адрасамі, якія зьяўляюцца на экранах кампутараў поруч з вынікамі пошуку. Доля гэтай формы рэклямы хутка расьце: летась фірмы ва ўсім сьвеце выдаткавалі на набыццё банэраў 2 млрд даляраў, а да 2007 г. гэтая сума вырасьце да 7 млрд даляраў. Іншай крыніцай даходаў «Google» зьяўляецца гандаль ліцэнзіямі на свае праграмныя прадукты, якія выкарыстоўваюцца іншымі пошукавымі сэрвісамі.

**СП; БелаПАН**

# 22222 галадае



**Галадоўка супрацоўнікаў фірмы «Радыётаксі 22222» у Ваўкавыску цягнецца больш за 2 тыдні. Цяпер адмаўляюцца ад ежы 30 чалавек. Такім чынам яны пратэстуюць супраць канфіскацыі падатковай інспэкцыяй аўтамабіляў «Мэрсэдэс», якімі карысталіся таксісты. Гэта найбуйнейшая эканамічная акцыя пратэсту мінулых гадоў. Мясцовая ўлада і прэса спачувае галадоўшчыкам, але падатковая не скасоўвае свайго рашэньня.**
**На фота: ваўкавыскі таксіст.**

# Ад Аўганістану да Іраку

**У сераду страты амэрыканцаў у Іраку пасьля заканчэньня баявых дзеяньняў дасягнулі сымбалічнай рысы — забіты сто шаснаццаты вайсковец. Гэта столькі ж, колькі ЗША страцілі ў баявых дзеяньнях. Ірацкая герылья шырыцца і, мяркуючы з амэрыканскіх страт, высокадакладная зброя для барацьбы зь ёй малакарысная. Прычым да партызанкі далучыліся ірацкія шыіты.**



СЯРГЕЙ ГРЫЦ

Напярэдадні апэрацыі ў Аўганістане прэса поўнілася змрочнымі прагнозамі адносна прывідных шанцаў Амэрыкі перамагчы талібскіх фанатыкаў і магчымасьці «загрузнуць» у Аўганістане на гады. Пасьля імклівага падзеньня рэжыму мулы Амара скептыкам заставалася бездапаможна разьвесьці рукамі. Трохі ў меншых маштабах тое самае адбылося ў Іраку. Між тым, цьвяроза паглядзеўшы на становішча, можна прызнаць за скептыкамі рацыю.

Аўганцы сапраўды выгналі ад сябе многіх захопнікаў, у тым ліку брытанцаў і Савецкі Саюз. Але амэрыканцы робяць у Аўганістане зусім ня тое, чым займалася савецкае войска. ЗША не «загрузьлі» ў Гіндукушы, бо іх там проста няма. Карзай сядзіць у Кабуле пад аховай немцаў. ЗША ўсур’ёз і ня ўвязваліся ў аўганскія справы, абмежаваўшыся налётам на Кабул і рэйдамі ў пошуках бэн Ладэна.

Пасьля зрынаньня талібаў краіна вярнулася да ціхай грамадзянскай вайны — у 1995 год. Замест Амара ў Кабуле сеў Хамід, дэманстратыўных праяваў барбарства ня стала, але жанчыны бурак не зьнялі. Міжнародныя сілы знаходзяцца ў Кабуле, дзе існуе некалькі паказальных школак ды міністэрстваў, а Наджыбула (даруйце, Карзай) ня мае ніякага ўплыву на справы на месцах. Бундэсвэр абяцае праз колькі тыдняў разьмясьціць свае сілы ў Кундузе — мірным, наколькі гэта магчыма ў сёньняшнім Аўганістане, месьце на поўначы краю. Паза ўладаньнямі магутных палявых камандзіраў. Як вынікае з інтэрвію Карзая «Нямецкай хвалі», ціхамірнасьць і была крытэрам, паводле якога выбралі Кундуз.

Бундэсвэр не наважваецца ваяваць з фэадальнымі арміямі, што трымаюць пад кантролем 90% аўганскае тэрыторыі, бо гэта азначала б пачатак вайны з усімі гэтымі ба́ямі і былымі камуністычнымі генэраламі — тое, на чым зламала зубы Масква. А таму ба́і працягваюць душыць супернікаў танкамі і вырабляць наркату. Згодна з ацэнкамі Праграмы ААН па барацьбе з наркотыкамі, ураджай опіюму-2002 у 20 разоў большы за паказьнікі 2001 г. Фактычна Вашынгтон пакінуў аўганскія разборкі немцам. А немцы, разумнейшыя ад саветаў, ня рвуцца суправаджаць караваны і культпаходы ў далёкія кішлакі.

У аўганскіх маджагедаў у часе вайны з саветамі на пачатку 80-х быў магутны саюзьнік — Злучаныя Штаты. Першыя пастаўкі амэрыканскай зброі для антыкамуністычнай партызанкі былі зробленыя ўжо ў 20 чыслах лютага 1980 г. Пасьля яны расьлі, а Рэйган прымаў барадатых байцоў у Белым доме, прылюдна абвесьціўшы, што «гэтыя людзі ў маральным пляне не саступаюць бацькам-заснавальнікам Злучаных Штатаў». Але ўрэшце справа аўганскага супраціву трапіла ў рукі пакістанскага SIS, які выгадаваў на амэрыканскія грошы талібаў. Сёньня наўрад ці хто ў стане дапамагаць антыамэрыканскім сілам так, як Амэрыка дапамагла антысавецкім. Нават іранскія клерыкалы. «Вартавыя ісламскай рэвалюцыі» перапраўляюць амуніцыю і ладунак найперш аўганскім аднаверцам-шыітам. Але тых у Аўганістане адсоткаў дзесяць.

Затое ў Іраку «вартавыя ісламскай рэвалюцыі» змогуць пасьпяхова ажыцьцявіць тое, што не ўдаецца ў Аўганістане. Шыіты ў Іраку пераважаюць, тут разьмешчаныя сьвятыя месцы шыізму, у Карбале загінуў імам Хусэйн. Дарэчы, менавіта ў Карбале загінуў «соты» амэрыканскі жаўнер і яго таварышы.

Падтрымка антыамэрыканскіх сілаў у Іраку здаецца Тэгерану спосабам супрацьдзеяньня магчымай амэрыканскай апэрацыі ў самім Іране. Прычым за прэзыдэнцтвам іранскага Гарбачова — рэфарміста Хатамі зь яго «дыялёгам цывілізацыяў» краіна няспынна павялічвала вайсковыя выдаткі ды працягвала распрацоўку атамнай зброі.

Шыізм стаў у Іране ідэалёгіяй тыраніі, але ў Іраку ён зьяўляецца рэвалюцыйнай ідэалёгіяй, і адпаведная іранская вайсковая дапамога можа ператварыць Ірак у галаўны боль Джорджа Буша. Амэрыка шукае дапамогі хаўрусьнікаў. Пакуль з гэтым праблемы, дарма што ўдалося дабіцца прыняцьця рэзалюцыі ААН. Адначасова Вашынгтон уводам турэцкіх войскаў у Паўднёвы Курдыстан вось-вось сутыкне міжсобку двух іншых сваіх саюзьнікаў — туркаў і курдаў.

Да таго ж, наконадні амэрыканскіх прэзыдэнцкіх выбараў у 2004 г. Буш мусіць стрымліваць рост колькасьці сваіх войскаў у Іраку, каб ня выклікаць у памяці выбарцаў згадкі пра віетнамскія жахі. Але каб перамагчы герылью, неабходна выкараняць яе асновы, і для гэтага патрэбныя войскі.

Як паказвае гістарычны досьвед, шанцы на перамогу тэарэтычна ёсьць у абодвух бакоў: брытанцы змаглі перамагчы ў джунглях малайскіх камуністаў. «Віетконг» змусіў ЗША і іх паўднёвавіетнамскіх саюзьнікаў адступіць. Прычым дакладных рэцэптаў посьпеху няма. У 1974 г., дзякуючы падтрымцы Вашынгтону, войска Паўднёвага Віетнаму ўваходзіла ў пяцёрку самых магутных арміяў сьвету. Войска іранскага шаха ў 1977 г. было ў гэтым рэйтынгу на шостым месцы. Налета ж Арганізацыя маджагедаў іранскага народу ажыцьцявіла ісламскую рэвалюцыю!

Управіўшыся з антыамэрыканскай герыльяй у Іраку, ЗША могуць ударыць па Тэгеране ягонай жа зброяй. Бо Ірак — радзіма шыізму, тут яго сьвятыні і традыцыйныя духовыя цэнтры. Пасьля рэвалюцыі 1979 г. вырасла роля духовых цэнтраў у самім Іране, але ўсё адно да аўтарытэту, якім карыстаецца ірацкі Наджаф, іранскаму Куму далёка. І ідэі іранскай рэвалюцыі імам Хамэйні распрацоўваў, жывучы ў Іраку. Таму праца з наджафскімі сэмінарыстамі дазволіць амэрыканцам перакінуць полымя ў Іран.

Абавязак кожнага шыіта — наведаць сьвятыні ў Іраку, таму, парадкуючы ірацкія справы, Вашынгтон будзе ўплываць і на настроі іранцаў, проста ці ўскосна. Амэрыканцы здолелі прыцягнуць курдзкія сымпатыі сваімі праектамі ў вольным ад Садама Паўднёвым Курдыстане. Аналягічным чынам можна прывабіць да сябе і шыіцкае насельніцтва Ірану. Як курды езьдзілі й езьдзяць у Паўднёвы Курдыстан па глыток свабоды, так і шыіцкія паломнікі будуць езьдзіць у Ірак, каб пераканацца, што можна жыць іначай.

І тады ЗША сапраўды пераможуць.

**Сяргей Богдан,**
студэнт факультэту міжнародных адносінаў БДУ

ЭЎРАІНТЭГРАЦЫЯ: ПОЛЬСКІ ДОСЬВЕД

# Эўрапейскія школьныя клюбы

**На тэрыторыі былога Беластоцкага ваяводзтва дзейнічае каля 90 Эўрапейскіх школьных клюбаў. Пра тое, чым яны займаюцца, распавядае Адам Казлоўскі**, прадстаўнік Падляскага рэгіянальнага цэнтру эўрапейскай інфармацыі ў Беластоку: «Агулам кажучы, яны папулярызуюць ідэі эўраінтэграцыі ды веды пра Эўразьвяз. Часта яны дзейнічаюць паралельна з профілем навучальнае ўстановы. Напрыклад, эўрапейскі клюб у Гастранамічным тэхнікуме наладзіў Фэстываль эўрапейскае кухні».

Пра гісторыю і асноўныя кірункі дзейнасьці Эўрапейскіх школьных клюбаў распавядае **Адам Барысевіч**, апякун Эўрапейскага школьнага клюбу імя Канрада Адэнаўэра пры 3-м агульнаадукацыйным ліцэі ў Беластоку, каардынатар Эўрапейскіх клюбаў падляскага ваяводзтва.

**А.Б.:** Эўрапейскія школьныя клюбы пачалі сваю дзейнасьць у Партугаліі ў 1986 г., калі краіна далучалася да Эўразьвязу. Урад зразумеў, што трэба выхоўваць моладзь для Эўропы. І там паўстала гэтая ініцыятыва. Вельмі хутка яна распаўсюдзілася па краінах ЭЗ і на пачатку 90-х дайшла да Польшчы. Эўрапейскія клюбы пачалі паўставаць спачатку на захадзе, ля нямецкай мяжы, бо менавіта зь Нямеччыны гэтая мода ішла. Так склалася, што на Падляшшы я з сваімі вучнямі заснаваў першы такі клюб, які дзейнічае да сёньняшняга дня вось ужо сем гадоў.

**— Зь якой мэтай засноўваюцца эўрапейскія клюбы?**

**А.Б.:** Клюбы гуртуюць моладзь у першую чаргу з інфармацыйна-прамацыйнай мэтай. Каб патлумачыць моладзі структуру, прынцыпы дзеяньня, карысьць й цану чальцоўства ў Эўразьвязе, каб раскрыць перад школьнікамі магчымасьці ўдзелу ў эўрапейскіх праектах, напрыклад у праграмах «Сакрат Камэнскі» ці «Моладзь», альбо ў праграме «Эразм» для студэнтаў. А паколькі сябрамі нашага клюбу зьяўляюцца маладыя людзі 16—19 гадоў, усё гэта іх вельмі цікавіць.

**— Якога роду гэта форма заняткаў? Ці гэта нешта падобнае да гуртку па інтарэсах?**

**А.Б.:** Клюб тым розьніцца ад гурткоў, што не належыць да абавязковых пазапраграмных заняткаў. Тут няма журналу, праверкі наведвальнасьці. Гэта свабодная форма заняткаў, якая менавіта таму і падабаецца моладзі. Маладзёны не адчуваюць прымусу, яны прыходзяць, толькі калі самі хочуць гэтага. Такіх зацікаўленых у нашым ліцэі 20—30 асобаў (яны прыходзяць на ўсе занятк), і ў два—тры разы больш вучняў прыходзяць на заняткі час ад часу.

А сёлета ў студзені пры ведамстве падляскага ваяводы, зь ягонае ініцыятывы, быў створаны Форум эўрапейскага дыялёгу для падляскай моладзі. Ён дзейнічае ў трох кірунках, між іншым гуртуе школьныя эўрапейскія клюбы. У лютым было абранае кіраўніцтва — гэта пяць чалавек, настаўнікі з розных школаў Беласточчыны. Гэтае кіраўніцтва каардынуе дзейнасьць усіх Эўрапейскіх школьных клюбаў. І ніхто, нават мы, хоць належым да кіраўніцтва, ня ведаем дакладна, колькі такіх клюбаў ёсьць у нас. Адны існуюць толькі на паперы, іншыя насамрэч дзейнічаюць. Іх колькасьць увесь час павялічваецца. І сёньня на тэрыторыі Падляскага ваяводзтва дзейнічае 80—90 клюбаў.

**— Вы сказалі, што заснаваны вамі клюб пры 3-м беластоцкім ліцэі дзейнічае ўжо сем гадоў. Ці вы маеце ўжо нейкія значныя дасягненьні, якімі маглі б пахваліцца?**

**А.Б.:** Найбольшым арганізацыйным дасягненьнем я лічу арганізацыю дзьвюх вялікіх імпрэзаў у маштабе ваяводзтва. 8 лістапада мы будзем ужо трэці раз ладзіць Падляскі эўрапейскі кангрэс. На леташні кангрэс апрача нашых вучняў прыехалі яшчэ амаль 500 зь іншых школаў — ад Сэйнаў да Семятыч і ад Кольна да Саколку. У траўні ладзім Падляскія эўрапейскія сустрэчы. Гэта такія масавыя мерапрыемствы, якія выходзяць па-за школы й ахопліваюць школьныя асяродзьдзі ўсяго ваяводзтва.

Апрача таго, мы абавязкова рыхтуем вучняў да разнастайных конкурсаў і алімпіядаў па эўрапейскай тэматыцы. Увесну я займаўся арганізацыяй такога агульнапольскага конкурсу ведаў пра эўраінтэграцыю. Нашыя вучні сустракаюцца таксама з вучнямі іншых школаў, якія толькі пачынаюць арганізоўваць у сябе эўрапейскі клюб і прыходзяць да нас па раду, па практычныя падказкі. Мы таксама супрацоўнічаем з разнастайнымі пазаўрадавымі арганізацыямі, як, напрыклад, Фундацыямі імя Робэрта Шумана, Конрада Адэнаўэра, Сьцяпана Батуры ці хаця б Падляскім цэнтрам эўрапейскай інфармацыі.

А вось што пра Эўрапейскія школьныя клюбы гаворыць **Яанна Калінька** — каардынатарка Рэгіянальнага цэнтру эўрапейскай інфармацыі ў Познані: «Эўрапейскія клюбы знаходзяцца ад самага, бадай, пачатку свайго існаваньня пад асаблівай апекай Рэгіянальнага цэнтру эўрапейскай інфармацыі. Такім чынам, у дадзены момант такіх клюбаў у велікапольскім ваяводзтве больш за 200. Мы па меры магчымасьці падтрымліваем зь імі пастаянны кантакт. Заўсёды было так, што калі мы маем нейкія матэрыялы, якія маглі б спатрэбіцца школьнай моладзі, то мы заўсёды адкладаем для іх такую інфармацыю й пазьней рассылаем. Дый наагул стараемся іх падтрымліваць, ці то сваімі ведамі, ці то матэрыяламі, ці дробнымі падарункамі. Таксама падтрымліваем усе мерапрыемствы, якія яны ладзяць у нашым рэгіёне».

**Эльвіра Богдан,**
Беларуская служба радыё «Палёнія»

# Прадстаўнічы фэст у Астраўцы

Стомленасьць ад нігілізму. Хіба гэтак можна вызначыць найноўшую культурную сытуацыю ў Беларусі. Пакуль адны на мяжы сваіх інтэлектуальных магчымасьцяў практыкуюцца ў зьнявагах палітычных апанэнтаў, другія — у разбурэньні традыцыйных формаў мастацтва й літаратуры, а трэція прысягаюць, што зробяць усё магчымае, каб зьліквідаваць беларускую дзяржаву, астатнія прагнуць нормы. Астатнія — гэта тры з паловаю мільёны паўналетніх беларусаў, якія на перапісе пацьвердзілі, што яны штодзённа паслугоўваюцца сваёй мовою. Гэтым людзям патрэбна адчуваньне грунту. Нацыя ня можа жыць дзесяцігодзьдзямі ў стане рэвалюцыі. І альтэрнатываю становіцца той самы спрадвечны грунт, што сілкуе нацыянальнае самапачуцьцё. Усё часьцей з розных куткоў Беларусі прыходзяць паведамленьні пра новыя культурніцкія ініцыятывы. Вось і гэтымі днямі ў Астраўцы працягваюцца ўрачыстасьці, прымеркаваныя да 120-годзьдзя з дня народзінаў літаратара й ксяндза Янкі Быліны (Яна Семашкевіча).

У мінулую суботу ў Астраўцы адбыліся чатыры вясельлі й адны хаўтуры. Усё як паўсюль. Але ў гэты ж дзень у фае тутэйшага кінатэатру «Кастрычнік» была ўрачыста адкрытая мастацкая прадстаўнічая выстава й адбыўся канцэрт, прысьвечаныя памяці Янкі Быліны. Бадай, ніколі ня бачыў старадаўні Астравец гэтулькі мастакоў разам. Яны прыехалі зь Менску й Вільні, з розных куткоў Беларусі. Уласна, выстава стала вынікам пленэру, што сёлета ў жніўні зладзілі грамадзкае аб'яднаньне «Вільняр» ды Астравецкі раённы аддзел культуры пры дапамозе Спондаўскага сельсавету. Блізу тыдня жылі й працавалі тройцы ў Лакцянах, роднай вёсачцы Яна Семашкевіча. Па суседзтву, у Клюшчанах, дзе пробашчамі былі нейкі час і Янка Быліна, і Казімер Сваяк, пасьля сьвяточнае імшы на касьцельным цьвінтары быў усталяваны мэмарыяльны камень. Тады ж, 9 жніўня, у тутэйшай вёсцы Масьцянах адбылося папярэдняе знаёмства з экспазыцыяй і прайшлі краязнаўчыя чытаньні. Навукоўцы й мастакі, сяляне й чыноўнікі мелі ўнікальны шанец пазнацца міжсобку.

І вось 25 кастрычніка ў Астраўцы сабраліся ўсе разам яшчэ раз. На выставе экспануюцца жывапісныя творы Віктара Маркаўца, Алеся Цыркунова, Алеся Пушкіна, Алега Аблажэя й Хрысьціны Балаховіч, Сяргея Харэўскага, а таксама землякоў з Астравеччыны Рычарда Грушы, Алеся Буйвідовіча, Стафана Казлоўскага, сёстраў Ірэны Герасім і Тарэсы Варановіч. Тута ж можна пазнаёміцца з выцінанкамі Тацяны Маркавец, фататворамі Алеся Юркойця й Дзяніса Раманюка.


Мастакі з розных куткоў краіны змалёўваюць касьцёл у вёсцы Клюшчаны

Пасьля кароткае прэзэнтацыі грамадзкага аб'яднаньня «Вільняр» і прадстаўленьня мастакоў перад цікаўнай публікай, адбыўся канцэрт «Намалюй мне песьню», для ўдзелу ў якім сабраліся ня толькі тутэйшыя выканаўцы. Адмыслова з Гомелю завітала сюды Вальжына Цярэшчанка, а зь Менску прыехаў Зьміцер Сідаровіч.

За акном церушыла сівізну завея, тубыльцы маракавалі, ці надоўга гэты кастрычніцкі сьнег, недзе далёка-далёка, у сталіцах, нехта моршчыў ілбы над мапаю нашае краіны. А над разлогамі Астравеччыны чуваць былі нашыя, не чужыя песьні. Тут было што глядзець і будзе што згадаць. Тое, чаго мы даўно прагнем.

**Гары Куманецкі**
**Фота Алеся Юркойця**

**Янка Быліна (Ян Семашкевіч)** нарадзіўся 20 кастрычніка 1883 г. у вёсцы Лакцяны (Астравеччына). У 1907 г. скончыў Віленскую каталіцкую духоўную сэмінарыю. Служыў вікарыем, затым — ксяндзом у Ільлі (Вялейшчына), Цудзенішках (Ашмяншчына), Дварцы (Дзятлаўшчына), а таксама пад Вільняю. У 1917—18 г. браў удзел у арганізацыі Беларускае канфэрэнцыі ў Вільні. Удзельнічаў у складаньні «Мэмарыялу» беларускага сьвятарства да агульнапольскай Канфэрэнцыі біскупаў 1925 г. Ад 1928 г. быў прызначаны пробашчам у Дукшты Троцкага павету, затым у Ялаўку, што каля Сьвіслачы. Па вайне апынуўся на Беласточчыне, працаваў пробашчам у Мар'яноўскай парафіі, дзе й памёр у вёсцы Бомбля ў 1956 г. Друкаваўся ў «Гомане», «Крыніцы» й «Хрысьціянскай думцы», сатырычных часопісах «Авадзень» і «Маланка». Аўтар зборнікаў прыпавесьцей, вершаў і баек «На прызьбе» (1918) і «На покуці» (1934), камэдыі «Выбар старшыні» (1928). На беларускую мову пераклаў рэлігійнае: «Ражанец да Найсьвяцейшае Дзевы Марыі», «Песьні-жальбы», «Дарога крыжа».


Прыдарожны крыж у Лакцянах — на радзіме Янкі Быліны

Ганкураўскі ляўрэат хоча жыць у Беларусі



# Без скандалу няма францускай літаратуры

**У Менску з ласкі пасольства Францыі пабываў Андрэй Макін — францускі раманіст, расеец з паходжаньня. А.Макін зьехаў з СССР у Францыю 15 гадоў таму, каб пісаць дысэртацыю па творчасьці Івана Буніна. Зьехаў — і стаў францускім пісьменьнікам, аўтарам раманаў «Рэквіем па Ўсходзе», «Злачынства Вольгі Арбенінай», «Зямля і неба Жака Дорма»… А.Макін выдаў восем раманаў, за «Францускі запавет» ён і атрымаў у 1995 г. Ганкураўскую прэмію ды прэмію Мэдычы. Свой першы раман Андрэй Макін «прабіваў» вельмі цяжка: выдаўцы ня верылі, што расеец можа добра пісаць па-француску. Цяпер аўтар мае цалкам адваротную праблему: ня можа знайсьці людзкага перакладчыка на расейскую.**

Сустрэча Макіна зь беларускімі літаратарамі ў Пушкінскай бібліятэцы адразу вылілася ў спрэчку наконт таго, ці можа літаратар стаць вядомым, пішучы на чужой мове. Здавалася б, прыклад самога Макіна, як і прыклад іншага Ганкураўскага ляўрэата — Рамэна Гары (Эміля Ажара), а таксама Набокава й Кундэры, можа сьведчыць пра слушнасьць высновы. Тым ня менш, нашыя пісьменьнікі спрэс — ад Адама Глёбуса да Алеся Пісьмянкова — пайшлі «ў рожкі». «Мы па-расейску можам халтурыць, як халтуршчыкі ў савецкі час ставілі сьвінарнікі па калгасах. Мы можам пісаць па-расейску дэтэктывы, а вось для сябе літаратуру пішам па-беларуску», — даказваў А.Глёбус. Ва ўнісон яму гучалі галасы Леаніда Дранька-Майсюка і Алеся Пісьмянкова: «У нас ня можа нарадзіцца новы Леў Талстой ці Тургенеў, а толькі Коласы і Купалы. Пісьменьнік можа добра пісаць толькі на мове той краіны, дзе ён нарадзіўся». Скептычна гмыкнула на гэта крытык Ганна Кісьліцына і павярнулася ў бок Зьмітра Бартосіка: «Кідай пісаць па-беларуску, бо ты нарадзіўся ў Расеі». Макін праваказаў: «Няўжо ня хочацца паспрабаваць свае сілы і паэкспэрымэнтаваць, напісаць твор па-расейску?» Бартосік цьвёрда адказаў: «Пісаць па-расейску — значыць, зьдзяйсьняць здраду». — «Ясна, што карані кожнага з нас у нейкай этнаграфіі, але ж у гэтым і задача пісьменьніка, каб узьняцца па-над ёй. Іначай атрымліваецца нейкае бытапісальніцтва», — разважаў А.Макін.

Нашым пісьменьнікам Ганкураўскі ляўрэат быў ня дужа цікавы: яны ўсё імкнуліся пагаманіць пра сваё, распавесьці пра цяжкую долю беларускага пісьменьніка. Галоўны рэдактар «Вожыка» Алесь Пісьмянкоў і дырэктар Літфонду Вячаслаў Корбут наракалі на тое, што дзяржава ня хоча дапамагаць пісьменьнікам: «Паабяцалі даваць грошы на літаратурныя часопісы, а самі не даюць: аўтары ня могуць яшчэ за красавік ганарараў атрымаць». Мсьё Макін ветліва хітаў галавой на знак спачуваньня. І, у сваю чаргу, жаліўся на перакладчыкаў-суайчыньнікаў, якія францускае «вымушана» замяняюць расейскім «по нужде».

Пачуўшы, што ўлады ў Беларусі пабойваюцца пісьменьнікаў і таму ўсяляк прыцiскаюць іх, Ганкураўскі ляўрэат ажывіўся: «У вас улады прыцiскаюць літаратараў? Я б хацеў у вас пажыць!»

Пра літаратуру й самога Макіна гаварылі небагата і толькі пры канцы сустрэчы. Францускі госьць назваў сваімі настаўнікамі Івана Буніна і Марсэля Пруста. Паведаміў, што піша ад рукі, а потым пераносіць свае тэксты на кампутар: «У мяне вельмі вялікая інфраструктура тэкстаў: шмат чарнавікоў. Я працую крыху па-расейску: шмат перапісваю. Француская манера пісьма больш падобная да атакаў лёгкай кавалерыі».

Свайго чытача А.Макін уяўляе сярэднестатыстычным чытачом францускай літаратуры: «Гэта жанчына, ёй хутчэй за 40... Мяне зьдзівіла, што мае кнігі чытаюць і маладыя французы: мне нават уручылі Ганкураўскую прэмію ліцэістаў».

З падачы Андрэя Хадановіча загаварылі пра модных францускіх літаратараў — Мішэля Ўэльбэка і Фрэдэрыка Бэгбэдэра. «Параўноўваць іх нельга, — зазначыў А.Макін. — Уэльбэк — гэта сапраўдны пісьменьнік. А ў Бэгбэдэра — проста вытворчасьць тэксту, у якім няма канцэпцыі. Уэльбэк, вядома, майстар скандалу, які ўмее падаць сябе. Але без скандалу няма францускай літаратуры».

І, вядома, гутарка пра Францыю й францускую літаратуру не магла абмінуць тэму жанчынаў. «Спадару Макін, вы ў жыцьці хто — Дон Жуан ці Дон Кіхот?» — «Залежыць ад жанчыны», — галянтна адказаў пісьменьнік.

**Адам Воршыч**

# Народ чакае палітыкаў

**На дварэ восень. Такая ж, як і шмат папярэдніх і будучых. Але нешта зьмянілася ў нашым грамадстве. Нягледзячы на лінію па Бугу, мэнтальная мяжа паміж намі й Захадам амаль сьцёртая. Нікога ўжо ня зьдзівіш сучаснымі дарагімі крамамі, а таксама таннымі «сэканд-хэндамі».**

Мы жывём у часе, калі супэрмаркеты суседзяць зь міні-рынкамі, калі людзі, як на Захадзе, разьмяркоўваюць грошы на самае неабходнае: на жытло, ежу, праезд у грамадзкім транспарце. Набыцьцё чагосьці з вопраткі зьяўляецца адчувальным ударам для партманэту простага жыхара краіны. А побач зь імі новабагацкія езьдзяць на шыкоўных лімузынах. Сярэдняя ж кляса набывае квіткі зь Менску ў Віцебск у сучасны сядзячы вагон зь відыкамі і, папіваючы ў дарозе каву, па-дзіцячаму цешыцца дакрананьню да «эўрацывілізацыі».

Я памятаю, як першы раз, яшчэ пры савецкай уладзе, удалося трапіць на Захад. Як прывозіў цукеркі ды жуйкі, а потым па-дзіцячаму мерыў усе грошы на гэтыя жуйкі. І мне, тады падлетку, не было вядома, што Польшча і Ўсходняя Нямеччына даўно прайшлі гэты этап і разьмяркоўваюць грошы не на адпачынак, але на жытло, ежу й г.д. Мінула колькі часу, і я, стоячы зь сябрам на прыпынку, размаўляю пра чэргі ля польскай амбасады. А калі іду вуліцай, дык мяне ўжо ня зьдзівіш заходнім шырспажывам, у які цяпер можна апрануцца на любой «барахолцы». Наадварот, із зьдзіўленьнем гляджу на людзей, апранутых па-савецку, вызначаючы, што яны прыехалі аднекуль з Хоцімскага раёну.

І толькі чырвона-зялёны колер, што лунае над урадавымі будынкамі, нагадвае мне, у якой краіне я жыву. Пачынаеш разумець, што Ты й заходняя цывілізацыя — гэта два розныя сьветы, што нас разьдзяляюць амбасады і межы, каля якіх даводзіцца стаяць у чэргах часам па два дні. І вельмі цешышся з таго, што часамі вырываешся з гэтай шчасьлівай краіны куды-небудзь у Кракаў, Бэрлін альбо ў той жа Кіеў.

Восень. У гэтым годзе я адчуваю яе як восень сваёй краіны. Краіны, народ якой ужо стаміўся чакаць дабрабыту. Не, не таго, які абмяжоўваецца эўрарамонтамі і файнымі дзьвярыма на ўваходах поштаў і крамаў. А сапраўднага дабрабыту, пры якім чалавек зможа адкладаць ня толькі на самае неабходнае, але і на годны адпачынак, на годную ахову здароўя.

Гэта ўсё будзе толькі тады, калі за папулісцкімі выказваньнямі нашых палітыкаў будуць канкрэтныя дзеяньні да паляпшэньня сытуацыі. Калі яны нарэшце зломяць у сабе гэтыя быдлячыя, рабскія стэрэатыпы і пачнуць глядзець на ўсё з пункту гледжаньня сучаснага чалавека. Бяз грэблівасьці да простых людзей — ня так, як да матэрыялу, зь якім можна працаваць, а потым выкінуць яго.

Нам трэба гэта, каб і ў нашую краіну прыйшла вясна. Вясна, да якой народ краіны ўжо падрыхтаваны й чакае толькі кроку палітыкаў. Гэта апошні шанец вярнуцца да сябе й захаваць тое, што было зроблена за гады незалежнасьці. Народ даўно гатовы да цывілізацыі. Слова за палітыкамі.

**Міраслаў Сакольскі, poczta.onet.pl**

Сярэдняя кляса набывае квіткі зь Менску ў Віцебск у сядзячы вагон зь відыкамі і, папіваючы ў дарозе каву, па-дзіцячаму цешыцца дакрананьню да «эўрацывілізацыі».

# Аднабокая ідэалёгія


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Першага верасьня мы даведаліся, што ў нас у школе ўводзіцца новы прадмет — ідэалёгія беларускай дзяржавы.**

Палітычная асьвета моладзі, разьвіцьцё грамадзкай актыўнасьці — гэта добра. Мы ўсе будучыя выбаршчыкі, і з гэтай прычыны абавязаны арыентавацца ў палітыцы. Але, на жаль, заняткі па палітычнай адукацыі «косяцца» толькі ў адзін бок. Сярод рэкамэндаваных для падпіскі газэт — «Советская Белоруссия» і «Рэспубліка». Іншыя прапановы нават не разглядаюцца. Як мы можам вырасьціць палітычна адукаванае грамадзтва, калі ўжо з маладосьці нас прымушаюць глядзець толькі ў адзін бок?

Толькі тая краіна, дзе кожны чалавек зьяўляецца асобай і мае ўласную пазыцыю, можа дасягнуць росквіту. А пачынаючы кожны ўрок з навінаў дзяржаўных газэт, разумееш, што ўсё ў нашай краіне добра, што ня трэба імкнуцца да большага і наагул мы павінны дзякаваць дзяржаве за добрае жыцьцё. Гэта вельмі нагадвае мне СССР, калі грамадзтва ператварылася ў адзіны статак.

Яшчэ адзін прывід з часоў СССР наведаў нашу навучальную ўстанову. Гэта БРСМ, ці камсамол, як яго называюць па старой памяці настаўнікі. Шляхі, якімі яна павялічвае свае шэрагі, выклікаюць абурэньне.

У кожнай клясе павінна быць як мінімум 10% сяброў БРСМ, і трэба абавязкова дасягнуць гэтай лічбы. Я магу толькі паспачуваць клясным кіраўнікам, якім трэба выканаць гэты плян. Настаўнікі ў разгубленасьці кажуць: «Што мне рабіць, ніхто ж ня хоча ўступаць».

Вось і выходзіць, што ў БРСМ палова апынулася добраахвотна-прымусова. Вядома, вінаваціць у гэтым настаўнікаў і нават адміністрацыю школы будзе памылкова, бо яны — толькі апошняя прыступка доўгай чыноўніцкай лесьвіцы. Адказы на ўсе пытаньні трэба шукаць значна вышэй.

Крыўдна, калі кожнага чалавека прымушаюць думаць, рабіць і адпачываць як усе.

**Ігар Шырко, Маладэчна**

**«Наша Ніва» запрашае** да супрацы выпускнікоў і студэнтаў унівэрсытэтаў — людзей беларускіх, якія хочуць стаць журналістамі.

# Цемрашальства ў сьведамых галовах

**Некаторыя моманты чытацкае палемікі з нагоды сэксуальнага нумару «НН» яшчэ раз засьведчылі каляніяльную прыгнечанасьць мысьленьня прадстаўнікоў нават той часткі грамадзтва, што лічыць сябе сьвядома беларускай.**

Гэткім спадаром варта ўсьвядоміць адзін істотны момант: комплекс бессэксуальнасьці, гратэскавай цнатлівасьці беларусаў быў накінуты нам звонку разам з стэрэатыпамі аб безьдзяржаўнасьці да 1917 г. ды аб лапцях як нацыянальным гонары. «Напэўна, паны Луцкевічы, Уласаў і іншыя пачынальнікі «першай беларускай газэты» перавярнуліся б у сваіх магілах, каб пабачылі, ЯКІ характар нададзены цяпер іх некалі беларуска-адраджэнскай газэце...» — цьвердзяць такія, пыхаючы прафаннай недасьведчанасьцю. Вазьмеце ў рукі факсыміле «НН» ды знайдзеце нумар за 6 (19) жніўня 1909 г. Згаданыя паны на бачынах сваёй газэты рэклямуюць кніжную сэрыю «Сьвет полавых жарсьцяў» з тыповым зьместам: «Полавыя апараты», «Параваньне», «Эрэкцыя мужчынскага полу» etc. Тутака і рэклама кандомаў: «Мужчынскія, ня рвуцца, найлепшай замежнай рызіны, найтанчэйшай вычынкі». Калі паном-заснавальнікам той самай «НН» і няўтульна ў трунах, дык ад цемрашальства, што пануе ў паасобных сьведамых галовах.

«Носячыся па краю вэлясыпэдам, я спаткаў чорнавалосую, чарнавокую палескую прынцэсу. Мае мілыя другі! Маладосьць, вясна, фіялка, цёплая сінява высокага неба, дзе журчаць трэлі жаўранкаў, шырокі безгранічны прастор з шумлівымі барамі», — цытатка з успамінаў шаноўнага пана-рэдактара «НН» Аляксандра Ўласава. Пісаць пра любосна-эратычна-сэксуальнае карцела, але каньюнктура ды скіраванасьць выданьня вымагала большай колькасьці тэкстаў пра ўгнаеньні ды гадоўлю гавяды ў Новай Зэляндыі. Але сам Уласаў прызнаецца, што пра яго любошчы ведалі многія: «Усе мае ахвяры богу каханьня — Амуру — былі ўсім вядомы, бо я ўсім сустрэчным-папярэчным жывапісаў сваіх багінь».

Час ад часу на старонках газэты прысутнічала гендэрна-сэксуальная тэматыка. Адзначалася, напрыклад, што жанчыны «ў Амэрыцы свабодны, ня так залежны ад мужчын, як у нас. Шлюбы і разводы робяцца вельмі скора і лёгка». Найпрагрэсіўнейшыя людзі тагачаснай Беларусі — нашаніўцы — былі прафэсійнымі і ў гэтым.

«Дык пані хоча на amor sacra пабудаваць прыязьні паміж мужчынам і жанчынай, а як жа будзе з amor profana, як няслушна называе пані права натуры, якому падлягаюць усе?» — цікавіўся ў сваёй будучай сужаніцы Юльяны Мэнке «spiritus movens» беларускага руху Іван Луцкевіч. Відавочна, што падобнае пытаньне не нарадзілася экспромтам, а было плёнам доўгіх развагаў пра каханьне й сэкс. Тыя развагі зусім натуральна роіліся ў мысьленьні разам з думкамі пра беларускае нацыянальна-культурнае адраджэньне. Як урэшце не згадаць Купалы і Багдановіча зь іх эратычнымі творамі?!

Ды абясьсіленай душою
Ты можаш аднаго жадаць, —
Каб семя бурнае муское
У нетрах цела пахаваць...

Гэта Максім Багдановіч.

Купала нават да Паўліны Мядзёлкі ў госьці хадзіў, каб вучыць яе цалавацца. А Канстанцыя Буйла (Буйлянка), распавядаючы пра свой першы прыезд у Рэдакцыю «НН», наагул прапанавала нам усім няпростую загадку: было або не было ў яе зь песьняром штосьці шчыльнае. Мяркуйце самі: «На другім паверсе, у кабінэце рэдактара, была шырокая, мяккая канапа, вялікі дубовы стол з мармуровым пісьмовым прыладкам, засланы зялёным сукном. На стале стаяла вялікая прыгожая лямпа. Купала прынёс бутэльку лёгкага салодкага віна і яблыкаў. Мы селі на канапе, і я папрасіла яго прачытаць вершы, якія перад тым бачыла ў яго папцы». Гэтае падхмеленае чытаньне цягнулася нібыта цалюткую ноч...

Прыклады можна доўжыць а доўжыць. А што ж будзе, калі пра сэксуальныя моманты жыцьця нашаніўскіх дзеячоў ды іх погляды на гэты тэмат раскажуць прафэсійныя дасьледнікі іх біяграфій! Шкада, што гэта аж дацяпераз ня ўчынена.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

Вазьмеце ў рукі факсыміле за 1909 г. ды знайдзіце рэкляму: «Мужчынскія, ня рвуцца, найлепшай замежнай рызіны, найтанчэйшай вычынкі».

## Зь «пяцёркі» — агульнадэмакратычны блёк

**Набліжаюцца выбары ў палату прадстаўнікоў. Апазыцыя пачала падрыхтоўку сёлета, з утварэньнем так званае «пяцёркі». Але гэтая «пяцёрка» павінна перарасьці ў агульны дэмакратычны блёк усіх дэмакратычных партыяў. Толькі тады можна дасягнуць нейкіх станоўчых вынікаў.**

Выбары адбудуцца праз год, але рэклямаваць сябе трэба загадзя. Тым больш што цяпер ідзе працэс зьнішчэньня незалежных СМІ, зачыняюцца грамадзкія арганізацыі. Хутка будзе прыняты новы закон аб СМІ.

Апазыцыя магла б падвышаць свой рэйтынг вакол інтэграцыйных працэсаў, якія могуць прывесьці краіну нават да страты незалежнасьці. Пакуль ідзе «юзаньне» расейскага рубля й магчымага яго ўвядзеньня, патрэбна шырока тлумачыць грамадзянам наступствы гэтага кроку.

І дзе цяпер той запал, дзе прага да перамогі, якія былі ў пачатку 90-х? Ці ў нас проста няма нацыянальнага лідэра?

**Алесь Вялейскі**

# Банк для настаўнікаў

**...Вялікі Магістар пачынае з фугі Баха, імправізуе і натуральна ўводзіць у Гульню фрагмэнт з матэматычнага трактату Ляйбніца. Пэўны час разьвівае закладзеныя там ідэі, незаўважна пераходзіць да формулы з астраноміі, імправізуе на тэмы Космасу, зьвяртаецца да паэмы старажытнакітайскага аўтара, вяртаецца да Ляйбніца, улучае ў новыя культурныя кантэксты. Зачараваныя гледачы сочаць за разгортваньнем у часе і прасторы вялікай Гульні «з усімі сэнсамі ды каштоўнасьцямі культуры». Гэта «Гульня шкляных пэрлаў» Германа Гесэ.**

Настаўнікі — жыхары сваёй «пэдагагічнай правінцыі». Нашыя імправізацыі і варыяцыі на пэўныя тэмы мы зьдзяйсьняем разам з вучнямі. Але мы мусім выходзіць за межы ўрокаў і школьнае руціны ды працягваць дыялёг на «зададзеную тэму» ўжо міжсобку. Дзе, калі і як настаўнікі могуць свабодна, нязмушана і напоўніцу ўвайсьці ў міжасабовы, прафэсійны і эмацыйны кантакт па-за межамі пэдкалектываў? Мы маем пэдагагічныя нарады, сэмінары, курсы. Маем «Настаўніцкую газету» і прадметныя часопісы. Але ці кожны там можа выступіць альбо задаволіцца прапанаванай формай?

Абмен тэкстамі, ідэямі, думкамі, пэдагагічнымі напрацоўкамі і тэхналёгіямі праз Інтэрнэт мог бы стаць для настаўнікаў найбольш эфэктыўнай формай прафэсійных кантактаў. Што для гэтага патрэбна? Тры рэчы: прынамсі адзін кампутар з Інтэрнэтам для пэдагагічных мэтаў на кожны раён, спэцыяльны інтэрнэт-сайт пад эгідай Мінадукацыі і жаданьне настаўнікаў весьці дыялёг. Першае і трэцяе ў нас ёсьць. Няма сайту, які мае быць пэдагагічным форумам. Дзе настаўнікі маглі б пакідаць свае артыкулы, мэтадычныя распрацоўкі, тэсты, агляды літаратуры і г.д. Уяўляеце, які банк пэдагагічнай інфармацыі можна стварыць!

Пакуль жа незразумела нават, куды настаўніку зьвярнуцца са сваімі распрацоўкамі. У прадметны часопіс? Але ён дужа рэдка выходзіць, ды невядома яшчэ, ці надрукуюць. Нашы прадметныя часопісы чамусьці ня маюць e-mail. Даводзіцца «ісьці на пошту», рабіць бандэроль...


WWW.HR.DUKE.EDU

Тры гады таму я зацікавіўся кампутарнай праграмай дынамічнай геамэтрыі. Пачаў шукаць у Інтэрнэце калегаў. У Беларусі не знайшоў, бо няма адпаведнай формы для кантактаў. Калі ж зайшоў на адзін расейскі сайт і пакінуў сваё паведамленьне, то хутка атрымаў адказ з МДУ. Завязалася перапіска, абмен ідэямі і ў выніку — прапанова ўзяць удзел у стварэньні кампутарнага дапаможніка матэматыкі. Цягам чатырох месяцаў ішоў штодзённы абмен электроннай поштай, шматбаковы дыялёг аўтараў. Праца скончана, прадукт гатовы, але ж тое для расейскіх школ...

Час прысьпешвае стварэньне беларускага пэдагагічнага інтэрнэт-форуму і супольнай інтэрактыўнай скарбонкі. Аўтар гэтых радкоў адкрыты для дыялёгу і мае канкрэтныя ідэі для рэалізацыі праекту.

**І.Храпавіцкі, Глыбокае**
**janka_x@tut.by**

# У ЗША могілкі даглядаюцца цэрквамі

**Магілы беларусаў-эмігрантаў раскіданыя па ўсім сьвеце. Найбольш іх у Амэрыцы: там пахаваныя Арсеньнева і Віцьбіч, Тумаш і Адамовіч, Сяднёў і Золак. Даглядаюць іх эмігранцкія суполкі, хоць многія дзяржавы лічаць сваім абавязкам апекавацца пахаваньнямі суродзічаў на чужыне. Пра тое, як шануюць памяць памерлых землякоў беларусы-эмігранты, распавядае Вітаўт Кіпель.**



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Вітаўт Кіпель** — самы вядомы беларускі грамадзкі дзяяч замежжа. Нарадзіўся ў Менску ў 1927 годзе, з 1944 жыве на эміграцыі. Старшыня Беларускага інстытуту навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку. Апошняя яго кніга, напісаная сумесна зь сьв. пам. Зорай Кіпель, — «Беларускі й беларускамоўны друк на Захадзе» — была прэзэнтавана ў Менску на пачатку кастрычніка.




АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Сямейны могільнік эміграцыйнай дынастыі Сільвановічаў прытуліўся ў Іст-Брансуіку**

**У Злучаных Штатах уласна беларускіх могілак двое, і яны знаходзяцца ў ведамстве нашых праваслаўных цэркваў.** У Нью-Брансуіку (апякуецца Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква) і ў Саўт-Рывэры (яна — у грэцкай юрысдыкцыі). Могілкі называюцца праваслаўнымі, але рэлігійнасьць ці канфэсійная прыналежнасьць вялікага значэньня ня мае. Там хавалі ўсіх беларусаў: каталікоў, праваслаўных і баптыстаў. У Кліўлендзе ёсьць беларуская сэкцыя агульнагарадзкіх могілак, яна ў вельмі добрым стане і даглядаецца. А так беларусы ў іншых месцах пахаваныя на агульных цьвінтарах.

**Займаюцца доглядам цэрквы, якія адказныя за могілкі.** У цэрквах дзеля гэтага вызначаныя пэўныя асобы. Таму ў Нью-Брансуіку і ў Саўт-Рывэры беларускія могілкі знаходзяцца ў вельмі добрым стане. Там стаяць выдатныя помнікі, помнікі беларусам, палеглым за незалежнасьць Беларусі. На беларускіх могілках у ЗША існуе пантэон — там пахавана шмат выдатных беларускіх дзеячоў розных пакаленьняў. І на іхных надмагільных помніках напісаныя іхныя біяграфіі, ідэалы іх жыцьця. Шмат на якіх помніках ёсьць цытаты з нашых клясыкаў. У прыватнасьці, на помніку маіх бацькоў ёсьць словы Янкі Купалы: «Я ад вас далёка, бацькаўская гоні...».

**Некаторыя магілкі асабліва ўшаноўваюцца.** Час ад часу да іх ускладаюцца вянкі. Прыкладам, на магілы прэзыдэнтаў БНР Васіля Захаркі ў Празе і Міколы Абрамчыка ў Парыжы. Ведаю, што было невялікае паломніцтва на магілу Язэпа Варонкі ў Чыкага. Часам моладзь едзе ўскласьці вянок на магілу Натальлі Арсеньневай у ЗША.

Што тычыцца беларускіх помнікаў магільнага характару, то адзін быў пастаўлены ў 1947—48 г. у горадзе Мітэнвальдзе ў Нямеччыне. Ён быў названы «Ў гонар слуцкіх паўстанцаў». Другі помнік усталяваў спадар Попка на могільніку маленькага гарадка Ляймэн, недалёка ад Штутгарту. І варта згадаць таксама вялікі помнік у Канадзе. Пра Аўстралію я ня ведаю. Наагул, беларускія могілкі ў шырокім сьвеце — цікавая тэма для дасьледаваньняў.

**Хто вырашае, дзе хаваць, калі памірае нейкі адзінокі беларус?** Залежыць ад таго, чаго гэты чалавек хацеў пры жыцьці. Калі ён меў тэстамэнт і належаў да царквы, то, безумоўна, выконвaецца ягоная воля. Шмат такіх людзей. Я добра ведаў, прыкладам, вечнай памяці Пятра Палягошку, які напісаў кніжку «Ўспаміны з жыцьця пад савецкай уладай і з пабудовы Беламорскага каналу». Ён папрасіў, каб яго хавала царква. Альбо ведаю другі такі выпадак, калі **ведамы сьпявак Конюх завяшчаў царкве значную суму грошай, ягоная магіла даглядаецца.** А калі тэстамэнту няма, то тут справа складаная. Тады паховіны і, наагул, апеку над нябожчыкам пераймае штат, які вырашае, дзе і як будзе хаваць гэтага чалавека. Наагул справа тэстамэнту вельмі важная. У газэце «Бацькаўшчына» ці ў «Беларусе» калісьці быў артыкул «Пішыце тэстамэнты». Здаецца, аўтарам яго быў доктар Войтанка. Ён заклікаў эмігрантаў, каб пісалі тэстамэнты і ў іх прасілі беларускія інстытуцыі заапекавацца парэшткамі іхнымі. Бо інакш зрабіць юрыдычна гэта вельмі цяжка.

За апошні час беларускія могілкі ў Саўт-Рывэры вырасьлі. Калісьці яны былі малыя, але дакупілі зямлю. Пахавальнае бюро было зацікаўленае, каб гэтыя могілкі вырасьлі, і дапамагло набыць суседні зямельны ўчастак, дзе яшчэ быў дом.

**Новыя беларускія эмігранты ў ЗША перанялі шмат якія дзялянкі дзейнасьці ад старэйшых эмігрантаў.** У царкве мы маем маладых сьвятароў, новыя людзі ёсьць у Беларуска-амэрыканскім задзіночаньні, у рэдакцыі «Беларуса». Гэта ў Нью-Ёрку. Я думаю, тое самае адбудзецца і ў Чыкага. Я ня ведаю, як будзе ў Кліўлендзе. Але відавочна, што нацыянальнае жыцьцё на эміграцыі пераймаецца новымі людзьмі.

**Запісаў Сяргей Ёрш**



СЯРГЕЙ ГРЫЦ

# Круцяць Марачкіну рукі

Даўно тое было, а здаецца, як учора. У 1988-м. Апазыцыя рыхтавалася адзначыць забытыя Дзяды. Гэта насьцярожыла ўладу. Сьвяткаваньне не ўваходзіла ў яе пляны, у яе паняцьці. Тым ня менш, падзея насьпявала.

Дзесьці гадзін у дзевяць-дзесяць зазваніў тэлефон. Я ўзяў слухаўку. На дроце быў Зянон Пазьняк. Папытаўся, што робіцца за маім акном. Я не зусім зразумеў пытаньне — што павінна рабіцца за маімі вокнамі? А яны якраз глядзелі на пляц з садам перад Усходнімі могілкамі. Я зірнуў, але нічога асаблівага не заўважыў.

— А што павінна быць?

— Ды мо танкі нагналі? Міліцыі?

Танкі? Чаго танкі? Такога ў нашай краіне ня можа быць. Я тады, дый ня толькі я, а шмат хто, быў наіўны. У нашай краіне, у Беларусі, ня можа такога быць!..

Пасьля гаворкі па тэлефоне Зянон завітаў да мяне на кватэру, трошкі пасядзеў і сказаў: «Сёньня тут пачнецца вялікая канфрантацыя. Яе трэба зьняць на стужку. Але здымаць будзе забаронена. А зьняць край трэба. Трэба, каб ты прытуліў апэратараў — маскоўскіх, замежных, дазволіў ім здымаць праз вокны сваёй кватэры».

Сказаў гэтак і сам пайшоў у вір падзеяў, якія неўзабаве разгорнуцца імкліва, нязвыкла і нечакана. Хвілін праз колькі пасьля Пазьняка ў маю кватэру завіталі ці то два, ці то тры тэлеапэратары з камэрамі, пачалі прыкідваць, зь якіх кропак ім будзе лацьвей здымаць. А тым часам да Ўсходніх могілак пачаў зьбірацца люд. Я затрывожыўся, захваляваўся. Падзея пачала разрастацца ў сапраўдны канфлікт. Я, працаўнік дзяржаўнага тэлебачаньня, сам таго не жадаючы, уцягваўся ў гэты канфлікт. Нацяжка было вылічыць, адкуль вяліся здымкі, і мне было б бяды. Я, засьцерагаючы сваю сям'ю і кватэру ад непажаданых наступстваў, прапанаваў апэратарам перайсьці на аглядную пляцоўку на шаснаццатым паверсе. З гэтай пляцоўкі і напраўду было зручна весьці здымкі агляднай панарамай — ня тое што адно па вэртыкалі зь лёджыі. Але пра гэтую пляцоўку падумала і ўлада. Яна паставіла там сваіх службоўцаў, якія сказалі нам: «Сюда нельзя!» Мы мусілі вярнуцца ў маю кватэру. Але што кватэра! На пляцоўках перад Усходнімі могілкамі разгортвалася адна падзея за другой: некага ўжо хапалі, цягнулі ў машыны, аўтобусы. То я з сваімі дзецьмі і ўнукамі з хаты падаўся ў вір тых падзеяў. Вось ужо нейкія гіцалі чэпяцца да Зянона, спрабуюць валачы яго кудысь, але людзі бароняць. Запомнілася: Зянона бараніла колішняя настаўніца роднай мовы, цяжка хворая Еўдакія Мацюш. Яна якогась гвалтаўніка міліцэйскага адцягвала ад Зянона за валасы.

Усе былі ўзрушаныя, хадзілі і шукалі падтрымкі адзін у аднаго: «Хіба так можна? Людзі прыйшлі на могілкі, сёньня ж Дзяды…»

Не пасьпелі Зянона вырваць ад хапуна, як ужо мастака Аляксея Марачкіна павалаклі-пацягнулі ў аўтобус… Майму абурэньню не было мяжы! Я штосьць казаў, заклікаў валачэнцаў да розуму, да одуму, але нічога не дапамагала. Назаўтра ўсюды толькі і было гаворкі пра гэтыя Дзяды. Я расказаў пра ўсё, што рабілася перад маім домам, свайму галоўнаму рэдактару Паўлу Шаўчуку. Той неўзабаве напісаў дасьціпную задзірыстую паэму «Нарабілася бяды ў нядзельку на Дзяды». У ёй былі і такія радкі:

> Круцяць Марачкіну рукі,
> Мартыненку б'юць пад дых.
> Плачуць Содалевы ўнукі —
> Пашкадуйце хоць малых...

Я і напраўду ў той дзень быў неразлучны зь пяцігадовым унучкам Кастусём. Пасьля мне перадавалі: на якімсь партактыве абмяркоўвалі падзеі Дзядоў, дык згадвалі там і мяне, усур'ёз казалі: «А Содаль, каб ня быць арыштаваным, прыкрыўся малымі дзецьмі!» Прыкра гэта было тады чуць, прыкра ўспамінаць гэта і цяпер: за што мяне было арыштоўваць? Я ж быў на сваім падворку.

На тых Дзядах шмат хто быў затрыманы. Ня памятаю ўжо, як — ці позваю, ці сам — хадзіў у пракуратуру бараніць Марачкіна. Пратакол з маіх паказаньняў аформілі па-расейску. Я з гэтым не пагадзіўся, і калі мне прапанавалі падпісаць той пратакол, узяў і напісаў на ім: «Паказаньні даваў на беларускай мове, а гэта толькі іх пераказ». І расьпісаўся. Сьледчы нічога не сказаў, толькі паглядзеў на мяне неяк зьдзіўлена: бач, сам просіцца на ражон! Пачакай, пакажам мы табе яшчэ тваю беларускую мову! Ну а пакуль ідзі!

Працяг на старонцы 12.

# Круцяць Марачкіну рукі

Працяг са старонкі 11.

На тыя Дзяды мая гаспадыня вярталася з адпачынку з поўдня. І ніяк не магла дабрацца дадому — усё наваколье было ачэплена міліцыяй. З вакзалу дабіралася паўдня. Нідзе не прапускалі. А калі дабралася, зьдзіўлена спыталася: «Што тут у вас было?» І давялося ёй распавесьці, як круцілі Марачкіну рукі і Мартыненку білі пад дых. Мая нявестка, якая ў той дзень была разам з мною, сказала: «Каб ня ўбачыла ўсё гэта сама, ніколі б не паверыла. Падумала б, перабольшваеце!»

З восені 1988 г. Дзяды ў Беларусі сталіся днём памяці найперш тых, хто без аглядкі паклаў сваё жыцьцё на алтар Незалежнасьці. А іх у нас не адна тысяча. Гэта і Каліноўскі, і Багушэвіч, Насовіч, Уласаў, Ластоўскі, Луцкевічы, Жылуновіч, Чарвякоў… І, вядома ж, усе нашы паэты і літаратары. Зь імі мы сіла і моц. Яна нашы карані.

Да іх мы найперш ішлі і ходзім на свае Дзяды. То які ж трэба мець дрымотна закарэлы розум, каб у гэты дзень выстаўляць вайсковую і міліцэйную раць. Казалі людзі, што лясок цераз шашу насупраць могілак аж кішэў ад вайскоўцаў і міліцыянтаў на Дзяды 1988 году.

Навошта? Дзеля чаго?

Гэтыя пытаньні і да сёньня для нас надзённыя. Пра гэта гавораць і Курапаты, і ліквідацыя Коласавага ліцэю, і закрыцьцё беларускіх газэт, і падмена нашай мовы на так званым Беларускім тэлебачаньні… І пералік гэты можна доўжыць і доўжыць.

От мы з гэтым і ходзім да сваіх дзядоў, распавядаем ім пра наша жыцьцё, просім падтрымкі. На іхніх магілках прысягаем, што будзем трымацца і надалей іхніх традыцыяў, ні на цалю ня здрадзім, не адступімся ад іхніх здабыткаў, набыткаў, ідэяў…

У гэтым і моц нашых Дзядоў. Гэта павінны зразумець і ўладныя структуры, не супрацьстаяць актывістам, а разам зь імі, разам з усім народам ісьці да сваіх продкаў і каяцца перад імі за свае грахі, за сваё невуцтва.

**Уладзімер Содаль**



СЯРГЕЙ ГРЫЦ

# «Нарабілася бяды ў нядзельку на Дзяды»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«Сказ пра Лысую гару» адкрыў у беларускай непадцэнзурнай паэзіі цэлую эпоху. Стылізацыі пад яго пры канцы 80-х хадзілі па руках у велізарнай колькасьці. «Ведзьмакі» пладзіліся проста зь неймавернай хуткасьцяй: «Вядзьмак Лысагорскі-меншы» напісаў паэму пра тагачаснага сакратара ЦК КПБ па ідэалёгіі «Сказ пра Саўку Паўлава і групу хуткага адпору», «Вядзьмак Менскі» — «Наказ народным дэпутатам» і «Каб спраўдзілася на Беларусі ў Новым 1989 годзе!»... Але, мабыць, найбольш вядомымі сталіся дзьве паэмы, падпісаныя псэўданімам «Паўлюк Задзірасты», — «Нарабілася бяды ў нядзельку на Дзяды, альбо Як я быў на сапраўднай вайне каля свайго дому ў Менску 30.X.88» і «Як мяне адваджвалі ад «Талакі». У 89-м гэтыя ценкія самаробныя брашуркі карысталіся ня меншай папулярнасьцю, чым тагачасныя ж «Навіны БНФ».

**Павал Шаўчук**, які хаваўся за псэўданімам «Паўлюк Задзірасты», працаваў у 1988 г. у рэдакцыі навукова-папулярных праграмаў Беларускай тэлевізіі. На свае вочы ўбачыўшы жудасны разгон шэсьця на Дзяды, за адну ноч напісаў паэму.

Па горадзе напярэдадні шмат абвестак было, і ў скрыні паштовыя кідалі, расказвае Павал Шаўчук. «На самі Дзяды я заставаўся дома, але да Маскоўскіх могілак пайшоў мой сын, тады дзесяцікласьнік. І вось няма яго гадзіну, другую, трэцюю — я, вядома, захваляваўся. Пайшоў туды, а там — а машынаў, а шынэлёў!.. А Божачка ж ты мой! Прабіцца да людзей я ня здолеў, бо ўсё было ачэплена. І пабачыў, як тых людзей, якія прыйшлі на Дзяды, акружылі і пачынаюць сціснуць. Міліцыянты тыя пабраліся за рукі і пачалі сьціскаць кола: сціснуць, сціснуць — і вось-вось зробяць так, каб людзі самі падушыліся».

Праўраца на той бок, дзе сын быў, Павал Шаўчук ня змог. А спыніў вайскоўцаў, на ягоную думку, Пазьняк, калі апусьціўся на калені, а за ім і ўсе астатнія на калені сталі… (Пазьняка Шаўчук ведаў, бо той пісаў сцэнары для тэлезаняткаў па сярэднявечнай гісторыі Беларусі.)

Спыніў вайскоўцаў Пазьняк, калі апусьціўся на калені, а за ім і ўсе астатнія на калені сталі.

Пад уражаньнем падзеі прыйшоў Шаўчук дадому і за ноч напісаў твор. Сыну пачытаў — той кажа: «Праўду напісаў». Сябру пачытаў — Уладзю Содалю. Ён кажа: «Дай мне». Содаль — канспіратар — на рэдакцыйнай друкарцы надрукаваў, каб ня вылічылі, бо кожная машынка мела свае асаблівасьці ды стаяла на ўліку. А далей лёсу твору Шаўчук ужо і не ўсачыў. Тэкст «зажыў сваім жыцьцём».

Павал Шаўчук вучыўся ў Маскве, пераехаў у Беларусь толькі ў 1964 г. Паводле ягоных словаў, адкрыцьцё нацыянальнай гісторыі для яго пачалося з кніжкі Максіма Багдановіча. Тады ўжо стаў зьбіраць рэдкія кнігі: патрапіўся яму аднаго разу нават слоўнік Ластоўскага. У «Талаку» не ўваходзіў, але шмат каго ведаў зь яе, сустракаўся. Шмат было людзей і незнаёмых. Падыходзілі, казалі, напрыклад, «Добры дзень, я Ўладзь» — у канцы савецкага часу ў сталіцы Беларусі высьпявала нейкая такая канспірацыя. Было вельмі прыемна патрапіць туды, дзе ўсе гавораць па-беларуску.

Талакоўцаў уцісталі, згадвае Шаўчук, позвы ў войска выпісвалі, называлі іх антысавецкай арганізацыяй. З пратэсту супраць гэтых рэпрэсій і паўстала іншая паэма Паўла Шаўчука — пра перасьлед «Талакі». «У паэме выведзены зборны вобраз: я пісаў ад імя старога калекі, якому таксама выпісалі позву ў войска за ўдзел у «Талацэ». І ваенком, маўляў, заплакаў, убачыўшы мяне…»

Тыя брашуркі, што выходзілі пазьней, ужо друкавалі бяз аўтара — мо ў Вільні... А потым адзін калега зь іншай тэлевізійнай рэдакцыі прывёз з Амэрыкі газэту «Новое русское слово» з расейскім перакладам паэмы. Гэты чалавек быў з органаў, і пра гэта ўсе ведалі. Шаўчук пабачыў газэту ды кажа: «Дай мне». А ён у адказ: «Мне самому пад расьпіску яе выдалі». А потым, ужо ў 1989 г., прыйшоў польскі часопіс «Szpilki» зь перакладам паэмы на польскую. І напісана было: «Нелегальная беларуская паэзія».

«Кампэтэнтныя органы» аўтара не шукалі: ня той быў час на двары. Рабілі выгляд, што не існуе такіх твораў, каб не ўздымаць лішняга розгаласу. А хаваць Шаўчуку давялося ня рукапісы, а кінастужкі. Ён шмат здымаў чарнобыльскія раёны, рабіў фільмы пра гэтую аварыю, пра выселеныя вёскі, пра тых, хто працаваў на Чарнобылі пасьля выбуху. І паказваў, што Чарнобыльская катастрофа — вынік дзейнасьці сыстэмы. Дык, калі зьявіўся ГКЧП, ён свае стужкі пазакопваў, узяў адпачынак і паехаў на Нарач, каб там перасядзець. І з прыймачом тры дні сядзеў, ня спаў. Потым ужо вярнуўся, выкапаў свае фільмы. Цяпер жа, калі з часу падзеяў мінула 15 гадоў, ён палічыў, што прыйшла пара раскрыць і аўтарства паэмы.

## Аўтар гэтай ананімнай паэмы вырашыў раскрыць свой псэўданім



АРЦЁМ ЛЯВА

**Зьміцер Дзядзенка**

# Алесь Бяляцкі: «Старэйшыя баяліся»

**Пятнаццаць гадоў таму быў створаны Беларускі народны фронт. Гэта было 19-га, а 30 кастрычніка таго ж 1988 году ўлады ўпершыню ўжылі сілу супраць маніфэстантаў. Гэта было на Дзяды, калі тысячы людзей сабраліся ля Ўсходніх могілак. Акцыя не была спантаннай: «У нас была падпольная група, у якую ўваходзілі кіраўнікі і лідэры моладзевых арганізацыяў. Яна сфармавалася яшчэ на пачатку 80-х і складалася з 7—10 чалавек, якія выпрацоўвалі стратэгію далейшага разьвіцьця», — згадвае арганізатар «Дзядоў» Алесь Бяляцкі.**

**«НН»: Спадару Алесь, калі ўпершыню ў Менску адзначаліся Дзяды?**

**А.Б.:** Было гэта ў 1987 г. Якраз тады спаўнялася 50 гадоў з дня масавага расстрэлу энкавэдыстамі беларускіх пісьменьнікаў... Адзначалі ў сквэры Янкі Купалы, дзе намаганьнямі нефармальных аб’яднаньняў, найперш «Майстроўні» і «Тутэйшых», удалося сабраць чалавек дзьвесьце. Перад тым мы спрабавалі падаць афіцыйную заяўку ў выканкам Цэнтральнага раёну, але ўлады ўпрост ня ведалі, што зь ёй рабіць... Мы не атрымалі ніякага адказу — тады яшчэ не было закону аб правядзеньні масавых мерапрыемстваў. Гэта было ўпершыню.

**«НН»: А хто падаваў заяўку?**

**А.Б.:** Падавалі два чалавекі: я і Анатоль Сыс.

**«НН»: Як узьнікла ідэя стварэньня БНФ?**

**А.Б.:** У 1988 г. грамадзкая сытуацыя абвастрылася. Адчувалася, што прыходзіць канец камунізму, але ніхто ня ведаў, калі ён дакладна надыдзе... Пра «дэмакратыю» і «незалежнасьць» у той час гаварылі вельмі асьцярожна. Былі размовы нават пра «незалежную Савецкую Беларускую Сацыялістычную Рэспубліку». Многа было тады такіх дзіўных на сёньняшні дзень мадэляў… А як пачалі стварацца народныя франты ў прыбалтыйскіх рэспубліках, гэтая ідэя набыла папулярнасьць і ў нас — як сярод маладых (25—30-гадовых) актывістаў, так і сярод старэйшых. Апошнія, на жаль, былі нешматлікімі, гэтыя людзі ядналіся вакол групы мастакоў — Купавы, Куліка, а таксама вакол Зянона Пазьняка.

Ад моладзі ў паседжаньнях, дзе абмяркоўвалася неабходнасьць стварэньня Народнага Фронту, бралі ўдзел Вінцук Вячорка, Алесь Суша і я. Мы мелі сваю праграму дзейнасьці, мелі за сабой структуры, якія працавалі і ядналі сотні людзей. Паседжаньні адбываліся ў розных месцах, але мне добра запомніліся яны ў Інстытуце гісторыі АН. Абмяркоўвалася форма ўтварэньня, назва...

**«НН»: Калі праходзілі паседжаньні?**

**А.Б.:** Улетку 1988-га, на пачатку восені.

## БТ заклікала на Дзяды

**«НН»: Ці была якая канспірацыя?**

**А.Б.:** Фактычна не. Было вырашана, што арганізацыйны зьезд таварыства «Мартыралёг Беларусі» (першай праваабарончай арганізацыі, дарэчы) плаўна перацячэ ва ўстаноўчы зьезд БНФ. Улады, натуральна, адсочвалі сытуацыю праз сваю сетку інфарматараў. Акрамя таго, зьвесткі пра заплянаваны зьезд шырока распаўсюдзіліся сярод яго будучых удзельнікаў. Мы мусілі сабраць прадстаўнічую аўдыторыю. У гэтай справе абапіраліся на Саюз мастакоў і Саюз пісьменьнікаў, а таксама на моладзь з нашых арганізацыяў. Ідэя стварэньня БНФ была падтрыманая зь вялікім энтузіязмам.

Я быў у ахове зьезду, што адбываўся ў Чырвоным касьцёле. Мы мусілі стаяць у дзьвярах, глядзець, хто ўваходзіць у залю. Але, на свой сорам, спазьніліся. Здаецца, і зьявіліся своечасова, але ўжо заля была поўная. Людзі папрыходзілі раней — адчувалі, што нешта адбудзецца... А далей мы нармальна спрацавалі. Гэта датычыць эпізоду, калі нейкі камуністычны дзяяч выскачыў на трыбуну і пачаў перашкаджаць гаварыць Васілю Быкаву. Ён схапіў мікрафон, але і сказаць нічога ня мог — мову ў яго заняло. Ён адчуваў, што зараз будзе абвешчана пра стварэньне БНФ, і нічога ня мог зрабіць, ня ведаў, як зрабіць! Тады я і яшчэ адзін хлопец (цяпер ён працуе журналістам) узялі партыйца пад локці і вывелі. Гэта быў шок! На вачох усіх з залі выводзілі функцыянэра кампартыі! Нам наладзілі авацыю, а Быкаў узяў мікрафон і працягнуў прамову.

**«НН»: Што адбывалася ў першыя месяцы пасьля абвяшчэньня?**

**А.Б.:** Па першым часе, фактычна, шкілетам, на якім пасьля «нарасьлі» дзясяткі тысячаў сяброў БНФ, былі моладзевыя структуры. Таму што ніякіх структураў больш не было. Моладзь мела каля сотні няўрадавых (тады — нефармальных) арганізацыяў, і дзясяткі зь іх пацьвердзілі калектыўнае сяброўства ў БНФ. Яны мелі пэўныя кантакты, некаторыя — нават памяшканьні. На базе моладзевых арганізацыяў Фронт умацаваўся і здолеў падрыхтавацца да выбараў у Вярхоўны Савет.

Паралельна мы рыхтавалі Дзяды. Сытуацыя была нэрвовая, напружаная. Улады гэтым разам вырашылі «даць бой». Шчыра кажучы, мы меркавалі, што другія Дзяды пройдуць у такім самым фармаце, як і першыя. Што зьбярэцца 200—300 чалавек...

Яшчэ на пачатку кастрычніка 1988-га ўлады пачалі рабіць захады, каб акцыя не адбылася. Сыс і я зноў падалі заяўкі, вызначыўшы месцам правядзеньня Маскоўскія могілкі. Нас пасьлядоўна выклікалі: спачатку ў райвыканкам Першамайскага раёну, пасьля ў гарвыканкам і, нарэшце, у пракуратуру, дзе папярэдзілі аб крымінальнай адказнасьці. Улады спрабавалі сарваць акцыю, распаўсюдзіўшы інфармацыю па тэлевізіі, але гэта толькі прывабіла людзей. БТ гаварыла, што рыхтуецца нейкая небясьпечная акцыя, ды заклікала на яе не хадзіць. Але мы распаўсюдзілі ў Менску 12.000 абвестак пра Дзяды. Моладзь заклеіла імі ўсе пад’езды...

**«НН»: Якім чынам выдаваліся ўлёткі?**

**А.Б.:** Была нейкая «дапатопная» машына. Абвесткі былі надрукаваныя на зеленаватай паперы. А распаўсюдзілі мы іх якраз перад тым, як пайшлі паведамленьні па БТ і, здаецца, па радыё. Увесь Менск быў наэлектрызаваны: што там будзе?

## Учынак Каваленкі

**«НН»: Вашыя прагнозы ня спраўдзіліся, і на Дзяды прыйшлі тысячы людзей...**

**А.Б.:** У 1988-м уся сьведамая інтэлігенцыя прыйшла да Маскоўскіх могілак. Гэта была новая форма пратэсту і грамадзкай актыўнасьці. Для нас было неспадзявана бачыць, як каля могілак зьбіраюцца тысячы людзей. А яшчэ напярэдадні Аргкамітэт БНФ вагаўся, ці падтрымліваць акцыю.

Затрыманьні ўдзельнікаў пачаліся на скрыжаваньні вул.Каліноўскага з праспэктам. Міліцыянты імкнуліся схапіць тых, каго яны лічылі сябрамі Аргкамітэту. Тады спрабавалі забраць Зянона Пазьняка, зь якім мы былі побач. Я стаў актыўна перашкаджаць і ўрэшце сам быў схоплены. А Пазьняка людзі адбілі. Мяне адвезлі ў Першамайскі РАУС, адтуль — у суд, дзе далі 200 рублёў штрафу. На той час гэта былі вялікія грошы. Праз месяц дырэктар Інстытуту літаратуры Віктар Каваленка (я там быў асьпірантам) перадаў мне грошы на штраф, сабраныя з супрацоўнікаў. Ён жа пастараўся, каб я скончыў асьпірантуру, бо партыйныя органы, відаць, патрабавалі мяне выгнаць. «Вучыцеся, Алесь!» — казаў сп.Каваленка. Такая была агульная атмасфэра.

**«НН»: Колькі чалавек затрымалі?**

**А.Б.:** Недзе трыццаць—сорак. Частку хутка адпусьцілі, у тым ліку і журналістаў. Некатарым, як мне, далі штрафу, але на суткі нікога не пасадзілі.

Працяг на старонцы 14.



ФОТА З АРХІВУ АЛЕСЯ БЯЛЯЦКАГА

**Алеся Бяляцкага (у цэнтры) схапілі. А Пазьняка людзі адбілі.**




## «Я вас люблю...»

Паэтка і перакладчыца Ніна Мацяш запрашае менскіх сяброў на вечарыну, якая адбудзецца **12 лістапада** а 18.00 у Бібліятэцы Дому літаратара.

Адбудзецца прэзэнтацыя кніг: «Перабіраю самацьветы» (выбраныя пераклады з эўрапейскай паэзіі) і «Поры году» бэльгійскага паэта Франсуа Жакмэна.

## «Дзеяслоў» №5

Сярод далікатэсаў, прапанаваных новым «Дзеясловам», — паэзія Арлова, Някляева і Хадановіча, проза Федарэнкі, Дранька-Майсюка і Пацюпы, эсэістыка Кудраўца. Аўтары кажуць апошняе «Бывай!» Васілю Быкаву: нумар пачынаецца яго «Апалягетыкай інтэграцыі». «Дзеяслову» ўсё больш пасуюць назоўнікі «традыцыйнасьць» і «гермэтычнасьць». Пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў.

## Гісторыкі і ўлада

Грунтоўная манаграфія нямецкага навукоўца Райнэра Лінднэра, перакладзеная зь нямецкай Лявонам Баршчэўскім, будзе цікавая як гісторыкам, так і палітыкам. Дзяржаўныя кнігарні адмаўляюцца прадаваць выданьне з тае прычыны, што гісторыя ў ім не скончаецца 1994 годам. Пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў.

## Прэзэнтацыя «Кароткай энцыкляпэдыі старасьвеччыны»

**11 лістапада** ў Вялікай залі Дому літаратара адбудзецца вечарына, прысьвечаная 120-годзьдзю Вацлава Ластоўскага, з удзелам прафэсараў Анатоля Грыцкевіча і Арсеня Ліса, акадэміка Радзіма Гарэцкага, публіцыста Анатоля Сідарэвіча, дыплямата Пятра Краўчанкі, барда Алеся Камоцкага. Завадатар Язэп Янушкевіч. Вечарыну аздобіць прэзэнтацыя «Кароткай энцыклапэдыі старасьвеччыны» Власта. Пачатак а 18.30.

**Януш.**

# Рух у бок кабарэ

На кантрольна-прапускным пункце не было чэргаў. Новы візавы рэжым дзейнічае, яшчэ болей аддаляючы нас ад Эўропы і ад сяброў-суродзічаў па той бок мяжы. Але пра гэта ня надта хацелася думаць. Па містычнай завядзёнцы, падчас фэстывалю было, як заўсёды, добрае надвор'е. Сонца, блакітнае неба, шэрань у палец таўшчынёй, — што яшчэ трэба для добрага настрою пасьля халоднага засьнежанага Менску? Ну, можа, кубак гарачае кавы альбо куфаль халоднага піва, — хто што любіць. А той, хто любіць паслухаць добрае музыкі, таксама меў магчымасьць гэта зрабіць. Сёлетняя «Бардаўская восень» на Беласточчыне мела адметны фармат: замест двух дзён у Бельску канцэрты адбываліся цягам трох дзён у Беластоку, Бельску і Гайнаўцы. Не было традыцыйнай конкурснай праграмы, толькі выступы запрошаных зорак.

За дзесяць гадоў існаваньня ўзровень фэстывалю якасна зьмяніўся. Сёньня гэта салідная імпрэза, на якую ахвотна едуць музыкі, а гледачы ідуць сем'ямі. Можа, таму беластоцкая яе частка адбывалася ў канцэртнай залі Польскага радыё і трансьлявалася ўжывую, што ў Менску наўрад ці было б магчыма.

Апроч афішаў «Бардаўскай восені» на вуліцах Беластоку можна было пабачыць таксама афішы канцэрту «Zero-85», прызёраў «Басовішча», які мае адбыцца ў суботу. Беларуская культурная прысутнасьць робіцца ў Польшчы звычайнай зьявай, пазбаўленай фальклёрнай экзотыкі ды канфрантацыйнай фронды. Найноўшая генэрацыя адчувае сябе беларусамі, як тое мае быць. Шлях да самаідэнтыфікацыі перастаў быць рэвалюцыйным, як гэта было ў 80-я. Беларушчына нарэшце робіцца натуральнай, зручнай, свойскай. Падобныя зьмены адбываюцца і ў самой Беларусі.

На фэстывалі сёлета не прагучала ніводнай новай «змагарскай» песьні. Панаваў дух кабарэ — музыкі адпачынку, зьедлівага гумару, дэкадансу. Калі раней барды навыпрадкі кляліся ў сваёй любові да зямелькі роднай, то цяпер гэтая тэма гучала збольшага як настальгічная рэмінісцэнцыя. Лявон Вольскі густоўна дапасаваў адна да аднае песьні з «Народнага альбому», «Крамбамбулі» ды даробку «NRM». Крыху грамадзянскай лірыкі, крыху алькагольнай тэматыкі, адна песьня пра сьмерць. Да гэтага баян, скрыпка, акустычная гітара, плюс сьпевы разам з заляй, ды скокі пад сцэнай.

Барды на сваім фэстывалі, як заўсёды, апынуліся, на фоне калектыўных праектаў, у менш выгадным становішчы. І, як заўсёды, з гонарам гэткую несправядлівасьць адолелі. Другі дзень пачынаўся зь сьветлай лірыкі Камоцкага, адзінага ўдзельніка ўсіх папярэдніх фэстаў. Пасьля быў інтэлектуальны панк Мінскевіча і «WZ-orkiestra» на канец першага аддзяленьня. Пачынаючы ад «Цацачнай крамы» Вайцюшкевіч, шліфуючы саўнд і манеру выкананьня, пасьлядоўна рухаецца ў кірунку кабарэ. Яго «Паравіны году» — самы эстэцкі праект апошняга часу.

Андрэй Мельнікаў, нягледзячы на вайсковы шынэль і суворы выгляд, сьпяваў збольшага вясёлыя песьні, гудзеў у нос і болей, зноў-такі, нагадваў пра эстэтыку кабарэ, чымся пра сьпевы скаўтаў на Крапівенскім полі. «І тут выйшаў Шалкевіч» — так заўсёды хочацца распачынаць пра выступы Віктара Шалкевіча. Ён заўсёды крыху большы за клясычнага барда. Як у той показцы — крыху актор, крыху апавядальнік, зусім крыху правакатар. Цяпер Шалкевіч яшчэ крыху раяль, бо возіць у кішэні клявішную мінусоўку.

На трэці дзень фэстываль завітаў у Гайнаўку, дзе да выступоўцаў далучыліся Тамаш Суліма і гурт «Эўфарыя» зь Беласточчыны. Цёплая, свойская атмасфэра канцэрту мела лягічны працяг у гатэлі на начным джэм-сэйшне. Пра джэм-сэйшн «Бардаўскай восені» варта пісаць асобна. Дзе яшчэ раз на год могуць сабрацца разам і пайграць не для публікі такія розныя музыкі? «Najtańszy bilet do Sztuki», — гэтак кажа пра гэтыя сэйшны бязьзьменны гукаапэратар фэсту Дарак. Ён мае рацыю. Такі вось фэстываль. Прыязная публіка, знаёмыя сьпевакі, добрая музыка.

**Міхал Анемпадыстаў**

# Старэйшыя баяліся

**Працяг са старонкі 13.**

А Анатоль Сыс тады на Дзяды ня трапіў. Ён працаваў на тэлевізіі, і яму якраз зрабілі працоўны дзень ды, каб ня ўцёк на акцыю, прыставілі чалавека, які ўвесь дзень хадзіў за ім...

**«НН»: На Дзяды 1988 г. упершыню ў паваеннай Беларусі быў узьняты белчырвона-белы сьцяг.**

**А.Б.:** Сьцягі вывешваліся і да гэтага на розных менскіх будынках: на Опэры, на мастацкай вучэльні. Але на акцыі, сапраўды, нацыянальны сьцяг зьявіўся ўпершыню — калі частка людзей, што сабраліся на Маскоўскіх могілках, адступіла ў поле і перад імі прамаўлялі Арлоў і Пазьняк. Тады і ўзьнялі бел-чырвона-белы сьцяг. Нехта дастаў яго і трымаў у руках.

**«НН»: А чаму Аргкамітэт вагаўся перад Дзядамі?**

**А.Б.:** Старэйшыя баяліся. Было абсалютна незразумела, што будуць рабіць улады ў дачыненьні да арганізатараў, да ўдзельнікаў акцыі. Тады ўпершыню была ўжытая сіла. Яшчэ ўсе памяталі разгромы беларускіх асяродкаў у 70-я, перасьледы, атмасфэру віжаваньня за кожным нацыянальна сьведамым на пачатку 80-х. Таму старэйшыя пыгледаліся: чым усё гэта скончыцца?

### Мы адчувалі на патыліцах ледзяны подых

**«НН»: А чым магло скончыцца?**

**А.Б.:** Старэйшыя думалі, што камуністы адчынілі дзьверы, каб «нацдэмы» вылезьлі і можна было ім галовы пасьцінаць... Устаноўчы зьезд, а потым Дзяды паказалі, што сытуацыя зьмянілася. І старэйшыя таксама спалілі за сабой масты. Перад гэтым «нарываліся» на непрыемнасьці толькі мы. Таму можна сказаць, што беларускі рух выйшаў з падпольля і сфармаваўся ў кастрычніку 1988 г.

**«НН»: А што, было сапраўднае падпольле?**

**А.Б.:** У нас была падпольная група, у якую ўваходзілі кіраўнікі і лідэры моладзевых арганізацыяў. Яна сфармавалася яшчэ на пачатку 80-х і складалася з вузкага кола аднадумцаў — 7—10 чалавек, якія выпрацоўвалі стратэгію далейшага развіцця. У нас быў партыйны статут. Абмежаванае кола ўдзельнікаў дазволіла нам пазьбегнуць рэпрэсіяў з боку гэбэ, хоць мы заўсёды адчувалі на сваіх патыліцах ягo ледзяны подых...

Пазьней жыцьцё нас выпхнула на стварэньне легальных нефармальных аб'яднаньняў. У старэйшых не было нейкай арганізаванай структуры. Але мы ўвесь час абменьваліся інфармацыяй. Напрыклад, пра Зянона Станіслававіча я ўпершыню дазнаўся ў 1985 г. — што ёсьць такі чалавек, які працуе для Беларушчыны.

**«НН»: Мы гаворым пра 1988 год, а ўчора Вярхоўны суд забараніў «Вясну», якую Вы ўзначальвалі. Вы зноў застаяцеся бяз працы, і няма больш Каваленкі, які б вас прыкрыў. Вы не стаміліся пратэставаць, быць дысыдэнтам?**

**А.Б.:** Тады за гэта давалі гады, цяпер абмяжоўваецца суткамі. Тады нас былі адзінкі, цяпер праз суды праходзяць тысячы, ёсьць масавы рух пратэсту. Ёсьць зьмены.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Паравіны году

З гэтага альбому паўстае зусім ня той Тодар, якога мы ведалі з «Балядаў», «Палацу» і «Крыві». Тут ён становіцца сьпеваком гарадзкіх ускраінаў. Не без дапамогі барда Алеся Камоцкага, на вершы якога Тодар напісаў музыку. Музыка ўтульная, яе можна слухаць пры любым настроі, у любую пару (паравіну) году. У аркестры Вайцюшкевіча стала граюць ужо сем музыкаў, а ў запісе ўзялі ўдзел аж адзінаццаць. Сам Зьміцер закінуў духавыя інструмэнты: цяпер ён толькі сьпявае. З посьпехаў — самаіранічнае «Piano», «Перажыты дзень», прасьпяваны дуэтам з Ксеняй Мінчанкай, і пранізьлівая «Я ішоў да цябе».

**Сяргей Будкін**




Зьміцер Вайцюшкевіч і «WZ-orkiestra», 2003

МЕНСКАЯ ПРЭМ'ЕРА

# Конэры і К° супраць Фантома



MOVIEWEB.COM

Уявіце сабе «паралельны сьвет», дзе жывуць пэрсанажы розных літаратурных твораў. У другой палове XIX ст. там можна было б сустрэць капітана Нэма і Тома Соера, Чалавека-Невідзімку і Дарыяна Грэя. Якраз у такім сьвеце адбываецца дзеяньне фільму «Ліга выдатных джэнтэльмэнаў». Усіх гэтых герояў (і некалькіх менш вядомых) у 1899 г. зьбіраюць разам. Яны мусяць прадухіліць сусьветную вайну, якую пагражае разьвязаць загадкавы Фантом (пад маскай якога хаваецца адзін славуты літаратурны «кепскі дзядзька» аўтарства Конан-Дойла).

На жаль, у кіно гэтая ідэя прыйшла «з другіх рук»: стужка зьнята паводле аднайменнага ангельскага коміксу. І хоць сам комікс, кажуць, быў «на вышыні», фільм загнаны ў стандартныя рамкі жанру «коміксавай экранізацыі», які ў апошнія гады перажывае сапраўдны бум. Праз гэта немінучымі выяўляюцца стылёвыя і сюжэтныя паўторы: адны эпізоды «Лігі» нагадваюць «Людзей Ікс», другія — «Халка». Сюжэт прымушае часта заплюшчваць вочы на лягічныя «прагалы», а таксама на істотныя разыходжаньні з творамі-першакрыніцамі (так, Нэма, паводле Жуля Вэрна, памёр задоўга да 1899 г.). Спэцэфэкты ж месцамі выглядаюць «недацягнутымі».

Нягледзячы на гэта, ня варта адмаўляць сабе ў прагляздзе «Лігі», бо сустрэцца з знаёмымі пэрсанажамі ў новым амплюа ўсё адно цікава. Да таго ж, аматары «экшэну» знойдуць у стужцы пару-тройку неблагіх сцэн.

Засталося дадаць, што з «зорак» у фільме прысутнічае толькі Шон Конэры (які іграе супэрпаляўнічага Алана Куотэрмэйна), затое на яго паглядзець сапраўды прыемна. Далёка ня ўсе акторы на восьмым дзясятку так актыўна працягваюць кінакар'еру.

**Іван Пятроў**

Курт Вонэгут

# Гемарой з узьяднаньнямі

Калі я быў асьпірантам катэдры антрапалёгіі Чыкагскага ўнівэрсытэту, адразу пасьля другой сусьветнай вайны, на дошцы абвестак катэдры былі толькі вакансіі ў паўдзённую частку Ціхага акіяну. ЗША перанялі апеку над шмат якімі выспамі ў тым рэгіёне, за якімі раней наглядалі японцы. Паслаць пасьля марской пяхоты Злучаных Штатаў антраполягаў, каб тыя вывучалі звычаі, спадзяваньні і мары абарыгенаў, якія ніколі не варагавалі з Амэрыкай, было страшэнна мудра і гуманна з боку нашага ўраду.

Я не пераехаў з чыкагскага Саўзсайду на востраў Яп, скажам, зь яго агромністымі каменнымі грашыма, а замест гэтага вымушана паглыбіўся разам зь сям'ёй у звычаі кампаніі «Джэнэрал Электрык» у Скенэктэды, Нью-Ёрк.

Тым ня менш, магу ўславіць унёсак маіх калегаў-антраполягаў у збольшага пачцівае апякунства маёй краіны над карэннымі грамадзтвамі Япу, Труку, Панапэ і Касраэ на поўдні Ціхага акіяну. Наш нагляд скончыўся ў 1986 г., з заснаваньнем цалкам сувэрэннай дзяржавы — Фэдэратыўных Штатаў Мікранэзіі.

Адзначу таксама, што гэта рэдкі выпадак узаемна пачцівага зблізкэньня непадобных грамадзтваў з страшэнна непадобнымі культурамі: адно — ашаламляльна магутнае, іншае — да шкадобы слабое.

Калі, напрыклад, брытанцы занялі выспу Тасманію ў 1803 г., яны ўвогуле не далі сабе клопату даведацца хоць нешта пра абарыгенаў, іхную мову, рэлігію ці што там яшчэ. Яны проста загналі іх у нетры выспы — дзе ім заставалася адно памерці ад голаду. Апошняя карэнная жыхарка Тасманіі да апошніх дзён была экспанатам музэю ў Гобарце. Брытанцы ня мелі патрэбы ў спагадлівых і маладушных, вядома ж, парадах культурнага антраполяга. Усё, што ім спатрэбілася, — гэта стэнд для шкілета.

Гітлеру, калі ён вырашаў, што рабіць зь непадобнай культурай габрэяў у Эўропе, не спатрэбілася нават гэтага. Ён меў іншую праблему: куды дзяваць попел. Калі туркі пазбавіліся двух мільёнаў не падобных да іх армянаў падчас першай сусьветнай вайны, яны зрабілі тое самае, што сэрбы зрабілі зь непадобнымі касаварамі во гэтай вясной. Яны выгналі іх зь іхных хат, і многія, многія людзі не перажылі небясьпекаў ды хваробаў альбо, як апошні з тасманскіх абарыгенаў, памерлі ад голаду.

Тое, што брытанцы зрабілі з тасманцамі, ці эўрапейцы — з абарыгенамі ўсёй Заходняй паўкулі, ці нацысты — з габрэямі, ці сэрбы — з касаварамі, апраўдвалася так: «Яны не хрысьціяне». Не бярыце да галавы захопу зямлі. Але ў Злучаных Штатах, калі я быў малы, людзей, зь якімі мы ніколі не маглі сысьціся, гэткіх недачалавекаў, зь якімі мы не хацелі б нават жыць на адной плянэце, называлі так: «Камуністы!»

Сысьціся з камуністамі? Ніколі! Добры чырвоны — мёртвы чырвоны.

А цяпер я згадваю, якраз дарэчы ў Дзень памяці, іншы дзень у траўні 1945-га. Я быў адным з купкі амэрыканскіх ваеннапалонных, якіх выпусьцілі дзесьці на поўдні ад руінаў Дрэздэну, у пасьлейшай савецкай акупацыйнай зоне. Але Чырвоная Армія яшчэ не паказвалася. Вось жа, у той мясцовасьці бадзяліся самыя розныя ацалелыя па вайне людзі, разгубленыя і пакінутыя на суворую волю лёсу — улучна з ахвярамі канцэнтрацыйных лягераў, цыганамі, люнатыкамі, нямецкімі салдатамі, якія дагэтуль насілі зброю — што было вялікай памылкай, — і г.д., і да т.п.

Адзін нямецкі салдат, дазнаўшыся, што я амэрыканец, сказаў мне: «Цяпер вам давядзецца біцца зь імі». Ён меў на ўвазе камуністаў.

Я тады меў 22 гады, шараговец першага году службы пасьля трох гадоў вывучэньня хіміі ў каледжы, адстаўны стралок. Я яшчэ ня стаў культурным антраполягам, але я ўжо думаў як антраполяг, уважаючы, што ніводная культура, за выняткам нацызму, не заслугоўвае абсалютнай пагарды. Апроч таго, мой палітычны экумэнізм быў зусім натуральным у той момант, калі ўсіх нас неўзабаве мусіла падабраць Чырвоная Армія.

Дык я сказаў яму: «Не. Мы станем трошкі больш падобныя да іх, а яны стануць трошкі больш падобныя да нас». Калі б Гітлера выставілі напаказ, замест пахаваць, дарэчы, я б нічога ня меў супраць.

Тады я меў на ўвазе, што мы прымем некаторыя ідэалы, якія візнава-

> Працоўныя там казалі: «Мы робім выгляд, што працуем, а яны робяць выгляд, што плацяць нам», але, зрэшты, яны сапраўды працавалі і мелі досыць ежы, і жытло, і мэдычнае абслугоўваньне, хай сабе і паршывае. Цяпер усё гэта скончылася. Merde.

ла іхная краіна, я меў на ўвазе больш справядлівае пераразьмеркаваньне багацьцяў на карысьць рабацяг і іх сем'яў, а яны прымуць нашую любоў да свабоды слова і ўсё такое.

Калі б там быў які-небудзь афраамэрыканец, ён, магчыма, запярэчыў бы, што дома, у «Краіне Свабодных», ён нават ня мае права голасу, ня можа сядзець у аўтобусе, дзе яму падабаецца, ня можа паесьці ў большыні рэстарацыяў, можа выкарыстоўваць толькі адмысловыя грамадзкія прыбіральні і пітныя фантанчыкі і гэтак далей. (Я белы, дарэчы.)

Калі б там быў які-небудзь украінец, ён пэўна зьвярнуў бы ўвагу на тое, што ў «раі працоўных» урад наўмысна замарыў голадам мільёны людзей зь ягонага народу.

Ну і што! Я ўжо ведаў усё гэта. Я проста падумаў, што было б добра для ўсіх — і я ўсё яшчэ так думаю, — калі б найбольш чалавечныя з памкненьняў камуністаў і нашых памкненьняў збліжаліся. Хто ж мог сказаць, што гэтыя памкненьні зь цягам часу могуць не перастаць быць вагонам лайна ў абедзьвюх краінах, ці прынамсі ў адной? Здараліся й дзіўнейшыя рэчы.

Так — і за 55 гадоў, што прамінулі з таго часу, каляровыя амэрыканцы, не без барацьбы, сапраўды здабылі грамадзянскія правы, калісьці прызначаныя толькі для белых. Больш за тое, ім ужо нельга забараняць карыстаньне пэўнымі рэстарацыямі і гатэлямі, і грамадзкімі прыбіральнямі, і пітнымі фантанамі, і пэўнымі часткамі аўтобусаў — і белыя банды больш ня могуць беспакарана вешаць іх, і гэтак далей.

І цяпер, калі ўжо няма Савецкага Саюзу, людзі ў краіне, якая калісьці была ягоным сэрцам, у Расеі, той самай, па якой мы ўсё яшчэ гатовыя нанесьці ўдар у адказ, маюць такую індывідуальную свабоду — гавораць што хочуць, езьдзяць куды хочуць, зарабляюць як хочуць, трацяць грошы на што хочуць — нібы ўжо і ў іхнай краіне атрымаў сілу закону амэрыканскі Біль аб правах. Як і ў Злучаных Штатах, яны нават маюць магчымасьць станавіцца гангстэрамі і рэкецірамі.

Што да належнага клопату пра звычайных рабацяг і іх сем'і, да забесьпячэньня іх сталай працай і дастатковымі заробкамі, каб яны маглі дазволіць сабе ежу, і дах над галавой, і мэдычнае абслугоўваньне, і каб іхныя дзеці маглі атрымаць прыстойную адукацыю, — гэта каштуе грошай. А Расея настолькі бедная на тэхналягічныя, інстытуцыйныя, прафэсійныя і духоўныя рэсурсы, каб прадаваць нешта на высокатэхналягічным глябальным свабодным рынку, што яна нічога ні за што ня можа сваім людзям плаціць.

У закрытай эканоміцы Савецкага Саюзу за грошы, якія ня мелі вартасьці ў вонкавым сьвеце, усё-ткі можна было набыць асноўныя тавары і паслугі ўнутры краіны. Працоўныя там казалі: «Мы робім выгляд, што працуем, а яны робяць выгляд што плацяць нам», але, зрэшты, яны сапраўды працавалі і мелі досыць ежы, і жытло, і мэдычнае абслугоўваньне, хай сабе і паршывае. Цяпер усё гэта скончылася. Merde.

У маёй роднай краіне і цяпер, як і заўжды, ёсьць вялізныя астравы скрайняй галечы, мільёны амэрыканцаў жывуць у гэтаксама кепска, як людзі ў якім Ляхоўскім ці Асташкаве. Але палітыкі і дробныя палітычныя партыі больш ня маюць права камандаваць. А нашыя карпаратыўныя кіраўнікі зь іхнымі біржавымі апцыёнамі, і так усё маючы магчымасьць карыстаць са скарбаў, якіх не было ў ніводнай краіне з былога камуністычнага блёку, цяпер яшчэ й атрымліваюць ад Уол-Стрыт прэміі за звальненьне работнікаў. Зноў merde.

Летась у кастрычніку я быў у Ляйпцыгу, горадзе ў былой камуністычнай дзяржаве, якая нядаўна зьядналася з рынкавай Заходняй Нямеччынай. Сытуацыя фактычна ўнікальная ў гісторыі, наколькі мне вядома, бо два грамадзтвы, якія былі ідэнтычнымі этнічна, гаварылі адной мовай і да канца другой сусьветнай вайны мелі супольную гісторыю, на момант узьяднаньня мелі вельмі адрозныя культуры што да індывідуальных свабод і стаўленьня да грошай.

Каб узьяднаньне было не такім ганебна насьмешлівым для ўсходніх немцаў, трэба было спытаць парады культурных антраполягаў ці, прынамсі, людзей, якія думаюць падобным да іх чынам, — а сярод палітыкаў такіх не бывае. Адна рэч, якую можна было б лепей зразумець і нешта зь ёй зрабіць, — мне здаецца, гэта пагарда, ці нейкае яшчэ горшае пачуцьцё, якое так шмат заходніх немцаў адчувалі да ўсходнікаў — задоўга перад узьяднаньнем.

Па стане на леташні кастрычнік у былой Усходняй Нямеччыне захоўвалася высокае беспрацоўе. Стратныя фабрыкі стаялі закрытыя. Маладыя людзі былі непадрыхтаваныя да працы ў высокатэхналягічных мэгаполісах. І тым ня менш, там дзейнічалі раскошныя крамы, накшталт тых, што можна ўбачыць у Монтэ-Карла. І я спытаў ляйпцыгскага журналіста, які браў у мяне інтэрвію: «Дзе сатырыкі і кабарэ-камэдыянты, якія павінны былі б высьмейваць гэткі зласьвесны вынік?» І ён мне адказаў: «А хіба Вы ня знаеце? Мы ж забілі ўсіх нашых габрэяў».

**Пераклаў Алесь Пяткевіч паводле «Forbes ASAP»**



АР

**Курт Вонэгут** — жывы клясык амэрыканскае літаратуры. Нарадзіўся ў 1922 годзе, браў удзел у другой сусьветнай вайне. Перш як стаць пісьменьнікам, працаваў паліцэйскім рэпарцёрам у Чыкага, рэклямным агентам у кампаніі «General Electric», гандляваў аўтамабілямі. Трынаццаць раманаў Вонэгута — цудоўнае спалучэньне гуманізму і пэсымізму, кранальнасьці й сарказму. Так мог бы пісаць Марк Твэн, каб перажыў дзьве сусьветныя вайны і Вялікую Дэпрэсію. У 1997-м Вонэгут надрукаваў раман-мэмуары «Часатрус» («Timequake»), пастанавіўшы болей да прозы не зьвяртацца.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Аркуш Алесь. Прывід вясны**. — Менск: Логвінаў, 2003. — 64 с. 200 ас.

Лідэр Таварыства вольных літаратараў упершыню адступіўся ад прынцыпу рэгіяналізму, што шырока культывуецца тэвээлаўцамі, ды выдрукаваў свой зборнічак у сталіцы. Сярод зьмешчаных у кнізе твораў — і новыя, і ўжо хрэстаматыйныя вершы (напрыклад, «Катрынка»). У «Кнігарні пісьменьніка» каштуе 5000 руб.

**Джэці (Вера Бурлак). За здаровы лад жыцьця:** Вершы. — Менск: Логвінаў, 2003. — 102 с. 200 ас.

Магчыма, чытаньне бадзёрых ды аптымістычных твораў, зьмешчаных у гэтым зборніку, заменіць каму-небудзь ранішнюю гімнастыку або нават і ледзяны душ.

**Кісялёў Г. Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст.** — 2-е выд. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 426 с. 2500 ас.

Пытайцеся ў шапіку пры Акадэміі навук. Цана 3000 руб.

**Парашкоў С. Гісторыя культуры Беларусі.** — Менск: Беларуская навука, 2003. — 444 с. 3000 ас.

Кніга рэкамэндаваная для студэнтаў ВНУ ў якасьці падручніка. У кнігарнях каштуе 3300 руб.

**Перапіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 году.** Мэтрыка ВКЛ. Кн. 523. Кн. Публ. справаў 1 / Падрыхт. А.Груша, М.Сьпірыдонаў, М.Вайтовіч; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 444 с. 700 ас.

Беларускія шляхецкія роды й арганізацыя вайсковай справы ў ВКЛ, колькасьць і разьмяшчэньне насельніцтва ў Княстве, адміністрацыйны падзел дзяржавы ды іншыя зьвесткі ўтрымліваюцца ў «Перапісе». У кнізе ёсьць і пералік вайсковаабавязаных грамадзянаў Княства з указаньнем тэрмінаў іх службы. У «Акадэмкнізе» каштуе 9500 руб.

**Слоўнік мовы «Нашай Нівы»:** У 5 т. Т. 1. А—Д / Нав. рэд. В.Лемцюгова; Уклад. А.Анісім, І.Капылоў, В.Лемцюгова, Г.Усьціновіч. — Менск: Тэхналёгія, 2003. — 624 с. 800 ас.

412 нумароў «Нашай Нівы» (1906—1915 г.) расьпісаныя па асобных словах і ўстойлівых выразах ды ўкладзеныя ў альфабэтны паказьнік. Картатэка лексэмаў налічвала 300 тыс. адзінак. Першыя чатыры тамы «Слоўніка» ў поўным аб'ёме адлюстроўць агульную лексыку й фразэалёгію, што дазволіць узнавіць лексычны склад беларускай мовы на этапе станаўленьня яе літаратурнай формы. Да кожнай лексычнай адзінкі прыводзяцца ілюстрацыі з тэксту газэты. У пяты том «Слоўніка» будуць уключаныя ўласныя імёны, прозьвішчы, псэўданімы, назвы населеных пунктаў.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Івонка Сурвілла

**Івонка Сурвілла** пераабраная Старшынёй Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, найвышэйшага прадстаўнічага органу беларусаў замежжа, на наступныя шэсьць гадоў. Гэта адбылося 25 кастрычніка ў Нью-Ёрку на 24-й сэсіі Рады, што зьбіраецца кожныя два гады.

**Лукашэнка** і **Кучма** абмеркавалі па тэлефоне эканамічныя пытаньні. Рандэву прэзыдэнтаў прызначанае на сярэдзіну месяца. Гэта будзе ўжо другая сустрэча двух прэзыдэнтаў на працягу двух месяцаў. У кантэксьце абвастрэньня расейска-беларускіх і расейска-ўкраінскіх адносінаў гэта выглядае знакам збліжэньня Беларусі з Украінай. У Менск прыляціць і газавы барон Туркменбашы Ніязаў, ад якога ўжо сілкуецца палівам Кіеў.

**Уладзімер Васілька** і **Сяргей Літвін**, заснавальнікі гандлёвае сеткі «Эўраопт», чакаюць рашэньня польскага экстрадыцыйнага суду. Беларускі МУС патрабуе выдаць бізнэсоўцаў, закідаючы ім удзел у арганізаванай злачыннай групоўцы і грахі эканамічнага характару. Бізнэсоўцы абвінавачаньні адкідаюць. Паводле іхнай вэрсіі, іх перасьледуюць за сувязь з апазыцыяй. (Быццам бы яны дапамагалі дэпутацкай групе «Рэспубліка».)

**Зьміцер М.**, якога ў Беларусі дзесяць гадоў шукалі па падазрэньні ў забойстве, таксама пераконваў уроцлаўскі суд, што пацярпеў за супрацоўніцтва з апазыцыяй. Паводле вэрсіі Зьмітра, бандыты змушалі яго адмовіцца ад казыно, з прыбыткаў ад якога ён дапамагаў БНФ. Аднаго з бандытаў М. забіў. Канчатковае рашэньне «выдаваць—не выдаваць» палякі прымуць 3 лістапада.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Івонка Сурвілла пераабраная Старшынёй на другі тэрмін. Статут Рады БНР колькасьці тэрмінаў не абмяжоўвае.**

## Яўген Краўцоў

**Яўген Краўцоў** не беларускі Хадаркоўскі, але ўсё ж ён быў адным з самых багатых людзей краіны. Цяпер ягоная справа перададзеная ў суд. Былому кіраўніку «Менсккомплексбанку» пагражае ад 8 да 15 гадоў турмы. Сьледзтва інкрымінуе яму пяць эпізодаў з агульнай сумай стратаў на 3,6 млн даляраў.

**Слонімскія камуністы** дамагліся ад гарадзкіх уладаў адмены падвойнага тарыфу на праезд грамадзкім транспартам у выходныя. Райкам ПКБ змагаўся 18 месяцаў: зладзіў збор подпісаў за адзіны дзяржаўны тарыф, даводзіў уладам, што цяжкасьці мясцовага аўтапарку — не падстава, каб парушаць правы спажыўцоў. Урэшце, рашэньнем выканкаму, нядзельныя квіткі патаньнелі ўдвая.

## Сямсот бежанцаў

**700 чалавек** маюць у Беларусі статус бежанца. Сярод іх 510 уцекачоў з Аўганістану, 83 з Грузіі, 28 з Таджыкістану, 27 з Азэрбайджану, 23 з Эстоніі, па некалькі з Палестыны, Ірану, Іраку, Індыі, Арменіі, Лібэрыі, Камэруну і Руанды.

Кантрактнік **Васіль Цьвіль** з калегамі скраў вайсковай амуніцыі на 33 млн рублёў. Цяпер чатыры гады будзе хадзіць ва ўсім казённым.

**Баўгары** працягваюць кідацца з крайнасьці ў крайнасьць. **Сімяон**, баўгарскі прэм'ер і былы цар, яшчэ тры гады таму страшэнна папулярны, зазнаў поўную паразу на мясцовых выбарах. Ягоная правацэнтрысцкая партыя ўзяла толькі 10% галасоў. Перамаглі ж сацыялісты (43% галасоў), абышоўшы правакансэрватыўны Саюз дэмакратычных сілаў (21%). У Баўгарыі яшчэ не было выбараў, на якіх партыя, што пры ўладзе, заваявала б народную падтрымку наноў.

**Дарыга Назарбаева** ачоліла «Асар» («Талаку») — новую казахскую партыю ўлады. Яна лічыць, што наступныя дзесяць гадоў палітычныя апанэнты яе бацькі Нурсултана могуць адпачываць. Яшчэ спн.Назарбаева сьпявае ў опэры, узначальвае дзяржаўны мэдыяхолдынг «Хабар», кангрэс журналістаў краіны. Жыве яна ў Вене з мужам — казахскім паслом — і траімі дзецьмі. З Аўстрыі будзе і «Асарам» кіраваць.

Італьянскі судзьдзя **Марыё Мантанара** падтрымаў мусульманаў, якія дамагаліся, каб у школе, дзе вучацца іх дзеці, папрыбіралі хрысьціянскую сымболіку. Рашэньне выклікала выбух эмоцыяў: кардыналы і некаторыя міністры абураюцца, прафсаюзы падтрымліваюць судзьдзю. Канфлікт укладаецца ў рэчышча спрэчкі, ці ўводзіць у Эўраканстытуцыю пункт пра хрысьціянскія каштоўнасьці як аснову эўрапейскае цывілізацыі.

**Кітайскі аматар інтэрнэт-форумаў** атрымаў тры гады турмы за тое, што ў Сеціве крытыкаваў уладу. У кітайскіх турмах сядзяць каля сарака гэткіх «злачынцаў».

## Энды Ўоргал,

самы дарагі мастак XX ст., і пасьля сьмерці працягвае пасьмейвацца з сваіх шанавальнікаў. Кожны шосты яго твор прызнаны несапраўдным. Іх стварылі памагатыя мастака, які меў звычку дарыць такія поп-артаўскія шэдэўры нават прыбіральшчыцам, што ў яго працавалі.

**СМ**

## Славамір Адамовіч

* * *

Ня вырвеш гэта зь мяне,
хоць многім хацелася гэтага.
Ніхто яго не кране —
майго агню апраметнага.

Яго не загасіш віном,
халодным півам і клёцкамі,
няхай жа гарыць ён суздром,
каб слабыя сталі моцнымі.

Агонь мой — што срэбра вады:
ён лечыць, і наталяе,
і мёртвыя гарады
дзеля жывых спапяляе.

Рогнан, 20 жніўня

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Алесю Г. з Барані.** Апазыцыя мусіць аб'яднацца, улада маральна састарэла, выбары павінны быць дэмакратычнымі — думкі слушныя, але няновыя.

**Усеваладу С. зь Менску.** Ваш твор выклікаў бы фурор на сьвяце Агінскага ў Залесьсі, але тыя чытачы «НН», якія там не былі, не да канца зразумелі б гумар.

**Э.О. зь Менску.** Артыкул пра Бяларучы выйшаў павярхоўны.

**Алесю К., Ліцьвіну зь Менску.** Закіньце сваю ідэю на інтэрнэт-форум «НН» — што скажуць іншыя чытачы?

**Кацярыне Б. зь Менску.** Вы заклікаеце людзей наведаць выставу Вашчанкі ў Мастацкім музэі, апялююч(ы) да іх грамадзянскае сьвядомасьці. Але ў музэі ходзяць зь цікавасьці. Вашаму артыкулу, каб тую цікавасьць у чытачах абудзіць, не стае дэтальнасьці й інтрыгоўнасьці.

**Яўгену Б. зь Берасьця.** Эсэ «Спраўка» сырое, думка часам перарываецца і пераскоквае з аднаго на другое. Друкаваць ня будзем.

ЗАПРАШАЕМ
**6–9 лістапада**
**«Золота підкова» Львоўшчыны**
Упершыню ў Беларусі — гістарычная экскурсія па **Львове** і шасьці навакольных замках (**Алеськ, Падгорцы, Залочыў, Крэхіў, Жоўква, Сьвірж**).
Два дні — начоўка ў гатэлі турклясы. Кошт — 45 у.а. (студэнтам — зьніжкі).
Плянуецца імпрэза ад Зьміцера Сасноўскага (гурт «Стары Ольса»).
Дакраніся да гісторыі!
Тэлефануйце: **222-88-61, 8-029-779-83-10.**
Заходзьце: вул.Фабрыцыюса, 9, пакой 13

## Андрэй ХАДАНОВІЧ

## Новыя лімэрыкі

Талмудыст-рэфарматар з Бабруйску
не працуе, бо ўзяў беларуску:
у шабат — завядзёнка,
у нядзелю — бо жонка,
і астатніх пяць дзён — у нагрузку.

Знакаміты лінгвіст зь Беняконяў
эўфэмізмы для школы ўзаконіў.
Сапсавалі паветра —
гэта ў слоўніку мэтра:
«пачалося цьвіценьне півоняў».

Культуртрэгер чувіху з-пад Быхава ў
ніцшэанскіх традыцыях выхаваў...
«Адкажы, сьвет мой люстра,
што казаў Заратустра?»
А люстэрка ў адказ ёй: «Чувіха — ваў!»

Дэгустатар напояў зь Бярозы
не прыходзіць да жонкі цьвярозы,
і штовечару шоў:
«А пайшла!..» — «Сам пайшоў!»
Ды ніводзін ня зьдзейсьніць пагрозы.

Пастаянны жыхар Валадаркі
сьніць паходы, каноэ й байдаркі...
А сусед — не каноэ,
а сьпіртное, сьпіртное,
не байдаркі — падаркі, падаркі...

Звар'яцеламу Віцю з-пад Віцебску
стаць кузуркаю хочацца, Віцю б скурыстакрылым зрабіцца.
Кажа: «Я — жамярыца,
нават маю ад лекара выпіску!»

• ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •

**ВІТАНЬНІ**

**Sabaka i Voūk** vinšujuc Kazak Taniu z Narodzinami! Usiaho najlepšaha

**Лідачка**, не сумуй у свой сьветлы Дзень Народзінаў! Сонца табе дапаможа! Няўдалы Суцяшальнік

**Ліда**, віншую цябе з Днём народзінаў! Зычу, каб жыцьцё тваё было сьветлым і шчасьлівым. Кацярынка

**Віншуем** наш сьветлы праменьчык з Днём народзінаў! Ліда, памятай: мы заўсёды з табой. 32 група

**Тацяну Казак** зь юбілеем віншуе Наста. Прыемнага табе, карэктнага спакою

**Казак**, шалёную і яскравую, віншую з Народзінамі. Кацярына

**Таня**, віншую цябе са сьвятам. Жадаю знайсьці нарэшце прытулак. Твой, асабісты. Aleś Pilecki

**Шаноўная** Казак Таня, 31-га — гэта апошні дзень месяца, але гэты месяц не апошні. Андрусь

**ДЗЯДЫ**

**Ушануйма** памяць продкаў! Збор 2 лістапада аб 11-й ля гадзіньнікавага заводу. Мітынг у Курапатах — а 15-й

**КАНТАКТЫ**

**Хлопец**, 20 гадоў, жадае пазнаёміцца зь беларускамоўнай дзяўчынай у Гомелі. Т.: 8-0232-72-06-60

**Навучым** усіх ахвотных прафэсійнай коннай язьдзе (1 месяц — 9 заняткаў, 32500 р.). Т.: 291-16-61. Марыя

**Юля,** сустрэнемся сёньня а 20-й на канапе для шчырай размовы. Яўген

**Шаноўныя** беларускія рок-музыкі! Зрабіце, нарэшце, нешта жыцьцесьцьвярджальнае ды за здаровы лад жыцьця! «Не» — алькагольнай «Крамбамбулі». Беларус

**2 лістапада** «Гарадзенская вандроўка» запрашае на экскурсію «Гарадзенскія замкі». Збор а 12-й ля помніка Вітаўту Вялікаму

**Аналіз** эканамічных рэформаў у Беларусі — сучасны стан, пэрспэктывы. Т.: 8-029-672-27-18

*Запрашаем на падарожжа*
**«Нёманская каса» 7 лістапада** (пятніца, выходны) па маршруце: Менск—Узда—Кухцічы—Наднёман—Нясьвіж—Сноў—Вялікая Ліпа—Вішнявец—Новы Сьвержань—Менск;
**1 лістапада: Ішкалдзь—Вольна—Сынкавічы—Слонім—Ружаны—Косава.**
Тэл. 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38, 8-029-776-24-35 (Павал).

**КНІГІ, МУЗЫКА, ІНТЭРНЭТ**

**Прадам** дыск «Я нарадзіўся тут», добры стан, 4500 рублёў. Т.: 271-19-82 (19.00-22.00). Ігар

**У Гомелі** ёсьць першы том «Слоўніка мовы Нашай Нівы». Т.: 45-11-51, 8-029-632-88-52 (толькі SMS)

**Набуду** ці прыму ў дар касэты беларускіх гуртоў («NRM», «ULIS», «Крама», «Крамбамбуля»). Т.: 245-17-37

**Кнігі**. Інфармацыя пра абмен, распаўсюд, друк, пошук кніг, фармаваньне прыватных бібліятэк. Т.: 8-0297-53-91-96

**Сайт** Маладога Фронту — цяпер абнаўленьне штодня! Пульс маладое Беларусі. Нацыянальная ідэя, кніга Паўла Севярынца — www.mfront.org!!!

**РАМОНТ ТЭХНІКІ**

**Рамонт** GSM-тэлефонаў, правадных і радыётэлефонаў, факсаў, тэле-, відэа-, аўдыё-, бытавой тэхнікі, кампутараў. Т.: 222-27-18

**ПРАЦА**

**Праца**, нескладаная, магчымыя добрыя заробкі. Т.: 8-029-766-12-79. Зьмітро

**Вашае здароўе** ў вашых руках. Набывайце лекі ды касмэтыку «Nature's Sunshine Products». Т.: 8-029-766-12-79

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, аднoўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3436. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 29.10.2003.
Замова № 5457 .
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а